www.nv-online.info

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

Народная Воля

№ 30 (4282)

13 красавіка 2018 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

НУ И НУ!

Что, в Гродно нет трезвых водителей?



Рисунок Ирины ПУСТОВАЛОВОЙ.

В Гродно в ночь с 7 на 8 апреля молодые люди из России захотели воспользоваться услугой «трезвый водитель». Помочь вызвался нетрезвый водитель.

По сведениям ГАИ УВД Гродненского облисполкома, компания на своей машине приехала отдохнуть в один из ночных клубов, где употребляла алкогольные напитки. Покинув заведение, ребята попросили таксиста отвезти их домой на принадлежавшем им автомобиле.

Таксист отказался, но предложил в качестве «трезвого водителя» своего коллегу. Молодые люди согласились. Прибывший мужчина сел за руль и повез компанию россиян по домам.

На улице Орджоникидзе машину остановили сотрудники ГАИ. В ходе проверки водителя стало известно, что количество алкоголя в крови гражданина вдвое превышает норму.

Мужчине грозит штраф и лишение водительских прав на 3 года.

ТОЧКА ЗРЕНИЯ

Александр ФЕДУТА



«Россия, готовься!» А Беларусь?!

Россия и США обменялись любезностями. Россия заблокировала американский проект резолюции по Сирии в Совете Безопасности ООН; президент Трамп в «Твиттере» написал открыто: «Россия обещает сбивать любые ракеты, выпущенные по Сирии. Приготовься, Россия, они прилетят: хорошие, новые и «умные»! Вы не должны поддерживать животное, которое убивает газом своих граждан и получает удовольствие от этого!». В переводе с дипломатического языка на человеческий это означает: одна сторона заведомо признает любые действия другой незаконными, а та, другая, плевать хотела на таковое признание с 58-го этажа «башни Трампа» в Нью-Йорке и обещает пострелять по правительственным сирийским войскам.

Это уже третья мировая война началась – или будут ждать выстрела нового Гаврилы Принципа в каком-нибудь Сараево? Та, первая, закончилась в 1918 году – вот, не дай бог, и отметят началом новой всемирной бойни столетний юбилей прекращения первой.

Но, предположим, обойдется и без всемирной потасовки. Ограничатся стрельбой на территории Сирии, в ходе которой и США, и Российская Федерация косточки слегка разомнут. Трамп на это, собственно говоря, и намекнул:

– Россия, готовься!

Бог с ней, с Россией! С нами-то, с Беларусью, что будет?

Экономически – оно как бы уже понятно. Российские олигархи потеряли свои миллиарды долларов, а курс белорусского рубля за несколько дней упал всего лишь на 7%. И это не катастрофа, и мы не олигархи: 7% туда, 7% сюда – все-таки не деноминация. В данном случае волнует иное.

Мы с Россией состоим в военно-политическом союзе, который никто пока не отменял. Это всегда любил подчеркивать главнокомандующий белорусскими Вооруженными силами. Де-юре нашего нейтралитета не существует. Поэтому возникает прямой вопрос: если обмен любезностями России и США не останется на бумаге и в эфире, а перейдет на уровень открытых военных действий, что же тогда будет с родиной и с нами? Трамп ведь политический безумец, но не идиот, и принцип «друг моего врага – мой враг» исповедует настолько очевидно, что никакой Макей, сколь бы красноречив он ни был, его не отговорит. И – когда он вспомнит о вернейшем российском союзнике?

Ладно. Предположим даже, что США долбанут по нашей территории не ракетами, а экономическими санкциями: введут их против предприятий, выпускающих продукцию двойного назначения (то бишь такую, которая и в военных целях применяться может). А мы ведь ничего не знаем о том, какие именно субъекты хозяйствования, кроме МЗКТ, под эти санкции тогда подпадут. Например, подпадут ли под них фирмы, зарегистрированные в Парке высоких технологий. Мы все, как и положено вежливым и нелюбопытным человечкам, уверены, что там исключительно «танчики» разрабатывают. А если, скажем, программное обеспечение к какой-нибудь летающей хренотени? Братцы, Трамп ведь и промахнуться может, а я на минском Юго-Западе живу – рукой подать…

Предположим, там ничего такого нет. Но о нашем союзническом статусе может вспомнить не только Трамп, но и Путин. И тут дело посерьезней будет. Он ведь не только союзник – он еще к тому же и кредитор.

– Барышня синеокая вы моя! Гуляли? Кредиты получали? Учения совместные проводили? Пожалуйте бриться!

В смысле: что к исполнению союзнического долга – будь готов!

И что нам отвечать? Мы ведь в условиях, когда союзнические обязательства прописаны в исключительно засекреченных бумагах, да так надежно, что никакой парламент их содержания до конца выучить не успел. У вас есть гарантии, что нашу молодежь не отошлют в составе отдельного добровольно-принудительного батальона воевать за любимого друга и торгово-экономического партнера Башара Асада именно в рамках обязательств перед Россией? Тут ведь аналогичный принцип действует: «Друг моего друга – мой друг и военно-политический союзник».

Хотелось бы получить в виде комментария от власти что-нибудь успокоительное, вроде валериановых капель. Ну, например:

– Граждане, не волнуйтесь! Согласно Конституции, мы – государство нейтральное, окажем гуманитарную помощь, причем обеим сторонам.

Трамп, конечно, чертыхнется, но помощь примет: к чему упускать то, что само плывет в руки, даже если это белорусский секонд хэнд?

Но мне что-то подсказывает, что возможен и иной вариант. Например:

– В рамках союзнических обязательств мы создаем временный ограниченный контингент вооруженных…

Ох… Дайте мне валерьянки…

КОГДА ВЕРСТАЛСЯ НОМЕР

Не называя сроков…

Президент США **Дональд Трамп** заявил, что никогда не обозначал точных сроков нанесения военного удара по Сирии. *«Я никогда не говорил, когда произойдет атака на Сирию. Это может быть очень скоро, а может совсем не так скоро»*, – написал он в четверг, 12 апреля, на своей странице в Twitter.

Одновременно он указал, что Администрация США под его руководством *«проделала отличную работу по освобождению региона от ИГ* (террористической группировки «Исламское государство». – **Ред.**)», а в конце своего твита задал вопрос: *«Где причитающееся Вашингтону «спасибо»?»*.

11 апреля американский президент сделал через Twitter резкое заявление, пригрозив России ракетным ударом в Сирии. *«Россия обещает сбить любые ракеты, выпущенные по Сирии. Россия, готовься, потому что они прилетят: хорошие, новые и «умные»!»* – написал хозяин Белого дома, отреагировав на высказывания российского посла в Ливане **Александра Засыпкина** о готовности Москвы сбивать ракеты ВВС США в случае удара по Сирии.

По данным гуманитарных организаций, в ночь на 7 апреля вертолет сбросил бочковую бомбу с химикатами над сирийским городом Дума. Большинство пострадавших мирных жителей – женщины и дети, отмечают активисты. По данным Всемирной организации здравоохранения, погибли не менее 70 и обратились в больницы более 500 человек. Инцидент расследует Организация по запрещению химического оружия (ОЗХО).

НЕЗАВИСИМАЯ ЭКСПЕРТИЗА

Борис ЖЕЛИБА, профессор, доктор экономических наук

Когда Нацбанк не при делах…

К 12 апреля, после выходных, курс белорусского рубля обвалился к доллару на 5,5% (2,07), к евро – на 6,6% (2,56). Курс российского рубля снизился на 0,58% и составил 3,23 белорусского за 100 российских.

Но Нацбанк оказался здесь не при делах. Все дело в стремительном девальвационном пике российского рубля. В эти же дни он пробил символический рубеж в 80 «деревянных» за евро и 66 единиц за доллар.

А всему начало положили новые санкции США в отношении Кремля, приближенных к нему российских олигархов и их компаний. Правительство РФ «в непропорциональной степени действует в интересах олигархов и правительственных элит», а кроме того, «продолжает оккупировать Крым, разжигать насилие в Восточной Украине, подрывать западные демократии, осуществлять злонамеренную киберделятельность и материально поддерживать режим Башара Асада, снабжая его оружием в то время, как он бомбит собственное мирное население», перечисляет американский Минфин.

В санкционный список, который уже насчитывает более 130 имен, добавились председатель «Газпрома» А.Миллер, глава ВТБ А.Костин. Вместе с ними под санкции попали миллиардеры О.Дерипаска со своими активами «Базовый Элемент», «Русал», En+Grup, российский сенатор от Дагестана С.Керимов, сидящий под домашним арестом во Франции, олигархи В.Вексельберг и И.Ротенберг со своими структурами и другие. Их активы в США «заморожены», наложен запрет на операции с ними во всех американских банках. Под санкции автоматически попадут любые компании, которые вознамерятся иметь бизнес с санкционными российскими юридическими и физическими лицами. Скорее всего, попадают под запрет все операции с российским государственным долгом, включая приобретение государственных облигаций Министерства финансов РФ и Центробанка РФ.

В первые дни после введения новых санкций российские олигархи на фондовых рынках уже потеряли более 17 млрд долларов. Владельцы их ценных бумаг спешат от них избавиться. Поэтому в первую очередь по курсу российского рубля ударил психологический фактор. Естественно, резкое ослабление российского рубля потянуло за собой и белорусский рубль. Нацбанк особо этому и не препятствует. Еще свежи в памяти события конца 2014 года, когда тогдашний глава Нацбанка Н.Ермакова в ответ на обвальное падение российского рубля заявила, что мы за российским рублем не побежим. Это стоило потерь в сотни миллионов долларов белорусскому экспорту в Россию…

По мнению многих аналитиков, российский рубль отыграет потерянные курсовые позиции. Но частично и вряд ли вернется на прежние отметки. Его укреплению может способствовать и возросшая мировая цена на нефть, которая достигла 73 долларов за баррель. По опыту прошлых лет, апрельская курсовая чехарда может навредить белорусскому экспорту в Россию. Тому же производителю авто Geely. Для белорусов подешевеют российские товары. В Беларусь может увеличиться поток российских нефтепродуктов. Это может уменьшить убыточные продажи «Нафтана» и Мозырского НПЗ на внутреннем рынке. Возможно, будет способствовать выравниванию цен на моторное топливо в Беларуси и России. Не исключено, что девальвация белорусского рубля подтолкнет инфляцию. В марте она и так поднялась до 5,4% в пересчете на год.

Многие белорусские предприятия, особенно государственные, могут получить немалые убытки с курсовых разниц, что окончательно испортит их финансы. Отдельным из них и так приходится большую часть выручки направлять на погашение кредитной задолженности. А падение прибыли – это недоплата налогов в бюджет. Девальвация национальной денежной единицы вновь отбросит зарплаты белорусов от заветных 500 долларов (в эквиваленте). До 90% белорусского госдолга номинировано в инвалюте. Девальвация означает автоматическое увеличение долговой нагрузки на экономику. Уже приходят в волнение рублевые банковские вкладчики, а Нацбанк с новой силой будет бороться с долларизацией экономики и окончательно прибьет до нуля депозитные ставки валютных вкладов. Его упорная и последовательная работа, направленная на укрепление доверия к национальной валюте, может пойти прахом. Впрочем, не будем сгущать краски. Может, Трамп и притормозит с санкциями.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Генадзь ФЯДЫНІЧ:

«На наступным тыдні ўладам зададуць непрыемныя пытанні»

Нагадаем, што бухгалтар прафсаюза РЭП **Ігар Комлік** утрымліваўся пад вартай з 2 жніўня 2017 года ў межах крымінальнай справы, узбуджанай супраць яго і старшыні прафсаюза РЭП **Генадзя Фядыніча** па ч.2 арт.243 Крымінальнага кодэкса РБ (ухіленне ад выплаты сум падаткаў, збораў у асабліва буйным памеры). 2 кастрычніка бухгалтар быў вызвалены з СІЗА пад падпіску аб нявыездзе.

Расследаванне справы працягнута да 1 мая.

– На наступным тыдні ў Беларусь завітае дэлегацыя Міжнароднай канфедэрацыі прафсаюзаў *і Глабальнага саюза IndustriALL,* – кажа **Генадзь ФЯДЫНІЧ**. – *Наколькі вядома, прадстаўнікі гэтых уплывовых міжнародных прафсаюзных арганізацый плануюць правесці шэраг сустрэч у Міністэрстве замежных спраў Беларусі і ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.*

– Якая мэта візіту?

– *У першую чаргу будуць узнімаць пытанне працы незалежных прафсаюзаў у краіне, а таксама ўладам будуць задаваць непрыемныя пытанні з нагоды невыканання рэкамендацый Міжнароднай арганізацыі працы. І ў абавязковым парадку закрануць "справу прафсаюзаў", якая не закрыта і цягнецца да гэтага часу.*

– Калі вас апошні раз выклікалі да следчага?

– *Некалькі месяцаў таму змяніўся склад следчай групы, якая займаецца гэтай справай, але з таго часу ні мяне, ні Ігара Комліка ніводнага разу следчыя да сябе не запрашалі. А вось нашых прафсаюзных актывістаў працягваюць актыўна "акучваць" па ўсёй краіне. Ужо дапыталі каля 550 сябраў прафсаюза РЭП, але гэтая лічба можа быць і большая. Я наогул не памятаю, каб па справе былі такія масавыя допыты.*

– Выезд за мяжу вам па-ранейшаму забаронены?

– Так, і гэтая тэма, мяркую, таксама будзе гучаць падчас сустрэчы з міжнароднымі калегамі. Мне трэба ездзіць на працоўныя сустрэчы, але ж такой магчымасці зараз няма. А сама справа, як бачым, "завісла" на нявызначаны час.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

ТАЛАКА

Беларускі пяцітомнік Святланы Алексіевіч будзе надрукаваны ўжо да 25 мая павялічаным тыражом

Прэзентацыя і аўтографсесія цыкла твораў нобелеўскага лаўрэата па літаратуры **Святланы Алексіевіч** «Галасы Утопіі» на беларускай мове і без цэнзарскіх правак пройдзе ў Мінску пасля 10 чэрвеня. Пакуль працягваецца збор сродкаў на гэтае выданне. Яшчэ застаецца 7 дзён, але грошай ужо сабрана ў пяць разоў больш, чым першапачаткова планавалася. Гэта значыць, як удакладнілі на краўдфандынгавай платформе "Вулей", якая займаецца фінансавым забеспячэннем праекта, што тыраж пяцітомніка значна павялічыцца.

– Беларусы праявілі актыўнасць: гэта хутчэй нармальна, чым дзіўна, – сказала менеджар праекта **Аляксандра Зверава.** – Велізарную інфармацыйную падтрымку кампаніі па зборы сродкаў аказалі многія. Сярод іх такія лідары грамадскай думкі, як **Меліціна Станюта, Уладзімір Цэслер, Віктар Марціновіч, Саша Раманава, Іна Радаева...**

Большую частку сродкаў на выданне кніг Алексіевіч на беларускай мове пералічыў "Белгазпрамбанк" і асабіста яго старшыня **Віктар Дзмітрыевіч Бабарыка.**

Над перакладам працавалі лепшыя беларускія літаратары, паэты, публіцысты: **Валянцін Акудовіч, Уладзімір Арлоў, Барыс Пятровіч, Андрэй Хадановіч, Сяргей Дубавец.** Ініцыятарам праекта стала кнігарня "Логвінаў".

Вікторыя ДРОЗД.

У сувязі з выхаднымі і Радаўніцай наступны нумар газеты "Народная Воля" выйдзе 18 красавіка.

ПАЛІТКУХНЯ

Лябедзьку папрасілі сысці

Днямі лідар АГП выказаўся аб сваім магчымым няўдзеле ў выбарах старшыні партыі. А ўчора маладыя дэмакраты АГП прынялі адмысловую заяву і прапанавалі ўнесці ў партыйны статут абмежаванне, паводле якога *"адна і тая ж асоба мае права займаць пасаду старшыні не больш за тры прадугледжаныя гэтым статутам тэрміны"*. Цяперашні кіраўнік АГП Анатоль Лябедзька пераабіраўся на гэтую пасаду дзевяць разоў – з 2000 года. Справа ў тым, што выбары старшыні АГП адбываюцца кожныя два гады.

Партыйная моладзь прызнае *"бясспрэчныя заслугі дзейнага старшыні АГП Анатоля Лябедзькі, якія знаходзіцца на сваёй пасадзе ўжо дзявяты тэрмін"*, і рэкамендуе яго кандыдатуру на пасаду ганаровага старшыні.

ДАРЭЧЫ

Канапацкая мае шанц?

У выбарах старшыні АГП мае намер паўдзельнічаць дэпутат Палаты прадстаўнікоў **Ганна Канапацкая**. Аб гэтым яна паведаміла на сваёй старонцы ў "Фэйсбуку".

Ганна ГАНЧАРЫК.

ЗАЗЕРКАЛЬЕ

Как будто и не было такого министра!

Не так давно МВД отмечало 100-летие внутренних войск. По этому случаю многие получили специальную юбилейную медаль.

«Этой наградой в первую очередь отмечаем заслуги тех, кто сотрудничал с внутренними войсками и содействовал их развитию, – объяснил замминистра внутренних дел генерал-майор **Юрий Караев**. – *Ее уже получили около 150 действующих стражей правопорядка и почти 850 ветеранов».*

Недавно такой медалью был посмертно награжден и бывший министр внутренних дел БССР (1978–1984) генерал-лейтенант внутренней службы **Геннадий Николаевич Жабицкий**. Его наградили *«за значительный вклад в борьбу с преступностью, охрану правопорядка и обеспечение общественной безопасности»*. Командующий внутренними войсками Юрий Караев вручил награду дочери Жабицкого – **Елене Атрашкевич**.

А почему аналогичной медалью не наградили **Юрия Захаренко**, который возглавлял милицейское ведомство в 1994–1995 годах? Дочери или вдове Захаренко тоже вполне могли бы вручить такую же награду. Если они согласились бы, конечно, ее принять, но это уже другой вопрос.



Юрий Захаренко был министром чуть больше года. За это время ведомственной милицейской газете «На страже» Юрий Николаевич дал лишь одно интервью, которое было опубликовано в №54 от 7 июля 1995 года под заголовком *«МВД сделало больше, чем могло, но меньше, чем нужно…»*. Вот цитата из этого интервью о реформе МВД 1994–1995 годов.

«Сделано много, – говорил Юрий Захаренко. – *Главное – оптимально расставлены кадры на ключевых направлениях деятельности органов внутренних дел. В корне реорганизована вся система МВД. Вместо существовавших тридцати разрозненных структур создано четыре главка, обеспечивающих четкое управление органами и подразделениями внутренних войск. Численность аппарата министерства сокращена на 260 единиц, упразднено 10 генеральских должностей. Изменились функции отраслевых служб МВД, которые переориентированы на конкретную практическую детальность в сфере борьбы с преступностью. Управленческой деятельностью заняты две трети аппарата, остальные выполняют предельно конкретные задачи по раскрытию наиболее опасных видов преступлений.*

Подготовлено около сотни законопроектов, постановлений, инструкций и приказов… С учетом кадровых потребностей в Академии милиции создан следственно-экспертный факультет и подготовлена солидная основа для открытия факультета внутренних войск…»

Захаренко, кстати, единственный из всех министров, кто не получил и медаль по случаю 100-летия белорусской милиции, которое широко отмечалось в минувшем году. Медаль вручали не только всем генералам, которые занимали высокие посты в милицейском ведомстве, но даже представителям шоу-бизнеса: **Александру Солодухе, Инне Афанасьевой, Виктории Алешко**, телеведущей **Люции Геращенко** и прочим. Как отметил замминистра внутренних дел генерал-майор милиции **Александр Барсуков**, *«в органах внутренних дел без участия представителей творческих профессий не обходится ни одно знаковое мероприятие»*.

На официальном сайте Министерства внутренних дел нет ни одного (!) упоминания о **Юрии Захаренко**! Как будто и не было такого министра вовсе!

«По Вашему запросу найдено 0 документов», – отвечает сайт МВД на запросы о Захаренко.

Зато есть информация про тоже бывших руководителей МВД генералов **Юрия Сивакова и Владимира Наумова**, которых демократическая общественность считает причастными к громким исчезновениям, в том числе и Захаренко. Есть на милицейском сайте информация про обвиненного в коррупции бывшего замминистра внутренних дел – начальника милиции общественной безопасности **Евгения Полудня**. Подробная биография висит, с фотографией!

А про **Юрия Захаренко** – ни слова, ни заметки, ни портрета, не говоря уже об информации о том, как расследуется дело о его исчезновении…

Марина КОКТЫШ.

ЗДАРЭННЕ

Назбіраў бутэлек…

У Жлобіне з трохметровай ямiны ратавалі 64-гадовага пенсіянера. Паводле слоў небаракі, ён хацеў сабраць бутэлькі і ўпаў у яміну з халоднай вадой. Самастойна выбрацца з пасткі мужчына не змог і пачаў крычаць. На шчасце, яго голас пачулі…

ГУЧНАЯ СПРАВА

18 красавіка пачынаецца суд над Аляксандрам Кныровічам



Справа вядомага бізнесмена, кіраўніка кампаніі "СарматТэрма-Інжынірынг", будзе разглядацца ў судзе Фрунзенскага раёна Мінска. На лаве падсудных акрамя Кныровіча апынуліся таксама дырэктар кампаніі "СарматТэрма-Інжынірынг", яго намеснікі і вядучы эканаміст.

Кныровіч знаходзіцца за кратамі ўжо другі год: яго затрымалі 25 студзеня 2017-га. Справу Кныровіча расследаваў КДБ. Бізнесмена абвінавачваюць ва ўхіленні ад выплаты падаткаў у асабліва буйным памеры. Паводле версіі следства, сума нявыплачаных падаткаў складае каля трох мільёнаў рублёў. Кныровічу пагражае абмежаванне волі на тэрмін да 5 гадоў або пазбаўленне волі на тэрмін ад 3 да 7 гадоў. Суд можа канфіскаваць у яго маёмасць, а таксама пазбавіць права займацца пэўнай дзейнасцю.

ТАА "СарматТэрма-Інжынірынг" з'яўляецца адным з першых вытворцаў папярэдне ізаляванай прадукцыі ў Беларусі, вырабляе трубы, прызначаныя для падземнай бесканальнай і надземнай пракладкі цеплавых сетак. Кампанія пастаўляе ПІ-трубы ў Мінск і іншыя рэгіёны Беларусі. Працуе з 1996 года. Аднак у лютым гэтага года Эканамічным судом Мінскай вобласці супраць ААТ "СарматТэрма-Інжынірынг" распачата справа аб эканамічнай неплацежаздольнасці.

ДАБРАЧЫННАСЦЬ

Сагрэць сэрца дзіцяці

Трыццаць гадоў працы тысяч валанцёраў, дзясяткі тысяч выратаваных жыццяў безабаронных дзяцей – вось што такое Беларускі Дзіцячы Фонд…

*З яго кіраўніком – вядомым пісьменнікам **Уладзімірам Ліпскім** – гутарыць наш карэспандэнт.*

– Уладзімір Сцяпанавіч, што і казаць, немалы шлях пройдзены фондам. Цікава, а як усё пачыналася?

– Гісторыя наша досыць доўгая. І нават больш доўгая, чым прынята лічыць афіцыйна. Справа ў тым, што яшчэ ў 20-я гады мінулага стагоддзя была створана арганізацыя "Дзеці Беларусі". Гэта на той час было надзвычай актуальна: Першая сусветная вайна, рэвалюцыя – усё гэта не магло не адбіцца на лёсах дзяцей, шмат іх засталося без бацькоў і ў літаральным сэнсе без даху над галавой. Але і ў тых цяжкіх умовах, калі выжыць было няпроста, знаходзіліся людзі, якія аддавалі свой час і сродкі на дапамогу дзецям. Ну і дзяржава дапамагала як магла…

Але праіснавала арганізацыя нядоўга. Не ведаю зараз чаму – можа, проста ўлады вырашылі, што зроблена досыць, што дзіцячыя дамы працуюць і не трэба болей грамадскасці гэтым займацца.

Адраджэнне грамадскай актыўнасці пачалося з 1987 года, калі ў СССР намаганнямі вядомага расійскага пісьменніка Альберта Ліханава, галоўнага рэдактара часопіса "Юность", быў створаны савецкі дзіцячы Фонд імя Леніна. У рэспубліках пачалі працаваць яго філіялы.

– І вы з самага пачатку былі кіраўніком?

– Так, з першага дня існавання. І потым, калі СССР не стала, калі ў незалежных дзяржавах былі створаны ўласныя дзіцячыя фонды, я ўзначаліў гэту работу і займаюся ёю ўжо 30 год.

Хачу адзначыць: стварэнне нашай арганізацыі было цалкам станоўча ўспрынята грамадствам. Заснавальнікамі яе сталі каля 50 арганізацый. У тым ліку міністэрствы, рэдакцыі розных выданняў… Памятаю, у Оперным тэатры ў Мінску праводзілі тэлемарафон па праблемах дзіцячага сіроцтва – ён доўжыўся цэлых 16 гадзін! Шмат людзей хацелі паўдзельнічаць, нехта дапамагчы…

Мы падрыхтавалі даклад аб праблемах дзяцей у Беларусі і распаўсюдзілі яго па ўсіх дзяржаўных установах.

Праз нейкі час Фонд выступіў з ініцыятывай прыняць Закон аб правах дзіцяці. Першы варыянт Закона рыхтаваўся досыць доўга. Мы не мелі досведу заканатворчасці – як маглі, так і напісалі. А калі закон быў прыняты, выступілі грамадскімі кантралёрамі яго выканання.

Дарэчы, памятаю дзіўны выпадак: пры прыняцці закона два дэпутаты прагаласавалі супраць. Па сённяшні дзень не магу ўсвядоміць: як можна было галасаваць супраць правоў дзяцей? Хацеў бы паглядзець у вочы гэтым асобам…

– Але ж ваша дзейнасць не абмяжоўваецца толькі лабіраваннем прававых актаў?

– Не, зразумела. Мы скіраваны на цалкам практычныя рэчы. Вось вам толькі адзін з мноства прыкладаў: за гады існавання фонду мы стварылі 43 дзіцячыя дамы сямейнага тыпу.

– Што значыць стварылі?

– Па-першае, практыкі такой у Беларусі не было, і давялося вырашаць шмат юрыдычных пытанняў.



Потым – патрэбны былі немалыя грошы. Шукалі спонсараў не толькі ў Беларусі, але і за мяжой – у Англіі, іншых краінах. Знаходзілі недабудаваныя катэджы, купілі, рамантавалі іх, набывалі мэблю, каб там можна было жыць вялікай сям'і з дзецьмі.

Але самае галоўнае – знайсці людзей, якім можна было б даверыць лёс дзяцей. І мы знаходзілі. Не магу ў чарговы раз не прывесці прыклад сям'і Маргарыты і Сяргея Кундзікавых з Клічава на Магілёўшчыне. Там выхавалі 43 дзіцяці-сіраты. І зараз працэс працягваецца. А прыёмная дачка Юля, якая з 13 год расла ў Кундзікавых, стварыла сваю сям'ю з біялагічным сынам прыёмных бацькоў. Зараз яны выхоўваюць семярых сірот, а таксама сваё маленькае дзіця.

…Не пакідаем такія сем'і без увагі. Каму дапамагаем матэрыяльна, каму – адраманціраваць дом… Было такое, што куплялі карову тым, каму яна была патрэбна.

А каму патрэбна была медыцынская, псіхалагічная дапамога, то вырашалі і такія праблемы. Бо розныя лёсы ў дзяцей… У адной дзяўчынкі на вачах маці з сужыцелем забілі бабулю. Дзіцё ўзялі ў прыёмную сям'ю, а яно два гады не гаварыла – не магло адысці ад перажытага.

І другі лёс. На чыгуначным вакзале ў Полацку знайшлі кінутае дзіця. Ішлі рабочыя, пачулі плач і ўбачылі… Пры афармленні далі хлопчыку імя – Герман. Бо так звалі рабочага, які яго знайшоў. Імя па бацьку – Сцяпанавіч, па аналогіі з дзядзем Сцёпам-міліцыянерам.

Я зацікавіўся, надрукаваў вялікі нарыс у тагачасным "Знамени юности". Прыйшло шмат лістоў ад людзей, якія хацелі ўсынавіць хлопчыка, нават вымушаны былі праводзіць конкурс. Потым сачыў за яго лёсам, дапамагаў, калі трэба было. Герман зараз кандыдат навук, намеснік начальніка ўпраўлення па міжнародных справах Міністэрства адукацыі.

– А колькі са створаных вамі дамоў сямейнага тыпу выжылі і існуюць сёння?

– Не паверыце – усе выжылі! Бацькі працуюць з новымі пакаленнямі дзяцей. Для іх праводзіцца семінары, мы возім іх у суседнія краіны да такіх жа прыёмных бацькоў: ёсць магчымасць пагледзець, як такая работа вядзецца ў іх, абмяняцца досведам.

– Дзяржава дапамагае?

– Зразумела, без дзяржаўнай падтрымкі нічога быць не магло. Мясцовыя ўлады трымаюць на кантролі справы сямейных дзіцячых дамоў. Мамы заўсёды атрымлівалі заробкі менавіта як мамы. Не самыя вялікія заробкі, але ўсё ж… Без падтрымкі ўлад і нашы асноўныя праграмы не маглі б існаваць.

Бо спачатку мы кінуліся дапамагаць усім. Потым толькі вызначыліся асноўныя напрамкі. Першае – паўплываць на грамадскую думку, прыцягнуць да дапамогі сіротам як мага больш людзей.

Далей – праграма "Цёплы дом": накіраванне сірот у сем'і, стварэнне дзіцячых дамоў сямейнага тыпу – я ўжо казаў пра гэта.

Вельмі важная праграма – "Дзіцячае сэрца". Мы накіравалі на лячэнне за мяжу і ў Беларусі больш за тысячу дзяцей з паракам сэрца і іншымі такога кшталту хваробамі. На дабрачынных асновах была прыцягнута да супрацоўніцтва брыгада спецыялістаў з 11 краін пад кіраўніцтвам доктара Вільяма Новіка. Яны правілі шмат аперацый і выратавалі вялікую колькасць дзяцей.

Аказваецца дапамога дзецям з анкалагічнымі захворваннямі. Вядзецца прафілактыка і лячэнне органаў зроку, іншыя ў межах праграм "Вясёлыя сардэчкі", "Я бачу" і г.д.

А Чарнобыльская праграма, па якой дзеці тысячамі выязджалі на аздараўленне ў 15 краін свету! Іх выпраўлялі ў дарогу, забяспечыўшы ўсім неабходным: ад бялізны да дарожных сумак.

У сувязі з Чарнобылем я хачу яшчэ ўспомніць Генадзя Грушавога і яго Фонд "Дзеці Чарнобыля". Цяжка пераацаніць тое, што было зроблена гэтым чалавекам!

– Дарэчы, спадар Уладзімір, і на самай справе ваш фонд не адзіная грамадская структура, якая працуе на ніве дапамогі сіротам. Як вы супрацоўнічаеце з імі?

– Былі такі перыяд, калі рабіліся спробы аб'яднаць грамадскія арганізацыі, якія працуюць для сірот, стварыць нейкія сумесныя праекты. Але не атрымалася. Цяжка сказаць чаму… Нібы і агульную справу робім. І ўсё ж канкурэнцыя…

А спробы, падкрэсліваю, былі. Нават агульную газету спрабавалі выдаваць пад назвай "Сям'я". Але супрацоўніцтва ўсё ж не атрымалася.

– Іншы раз даводзіцца чуць пра тое, што ёсць людзі, якія паразітуюць на справе дапамогі сіротам. З бываюць выпадкі махлярства з грашыма, нават гвалту над дзецьмі…

– У нашых структурах я такога не ведаю. Зразумела, не заўсёды і не ўсё гладка. Не так ужо рэдка даводзіцца, так бы мовіць, развязваць вузлы. Але самае горшае, што ў нашых структурах бывала: людзі бяруць дзіця, "пагуляюцца" з ім і потым аддаюць назад. Кепска! Трагічна для дзіцяці! Але тут крыміналу няма. Што зробіш, бывае так: людзі не зусім рэальна ацаніць свае магчымасці…

Бывае і інакш. Вось прыязджаю да мяне муж і жонка. Яны дзесяць год таму ўзялі на выхаванне хлопчыка… Жыве ён з імі, у яго асобны пакой, апаранты-абуты, накормлены, камп'ютар і гэтак далей. Але аднойчы раніцай ён адмовіўся ісці ў школу. Невядома чаму – пэўнай нагоды і сёння ніхто не ведае. І сам ён, хутчэй за ўсё, не ведае. Бацька разззлаваўся і ўзяў дзягу… Першы раз за 10 гадоў. Хлопчык у школу пайшоў, але паскардзіўся: маўляў, б'юць…

Назаўтра прыехалі прадстаўнікі ўлад і забралі хлопчыка. Ужо ён сам не рады – просіцца дадому. І бацькі ходзяць па ўстановах, а зрабіць нічога не могуць: ёсць папера за подпісам кіраўніка мясцовай улады.

Давялося мне прасіць таго кіраўніка, каб адклікаў свой подпіс. І ён, разумны чалавек, зрабіў гэта. Потым прыязджалі да мяне шчаслівыя бацькі, дзякавалі і казалі, што і для іх пэўны ўрок адбыўся.

Яшчэ раз кажу: не ўсё і не ўсюды гладка бывае. Не выключаю, што бывае і гвалт, і махлярства. Менавіта таму так важным становіцца самы першы этап: адбор людзей, якім дазволена будзе працаваць с сіротамі. І мы гэта памятаем…

– Як вы лічыце, сітуацыя з сіротамі ў Беларусі паляпшаецца? Сёння іх у краіне, паводле розных звестак, каля 30 тысяч…

– Скажу адразу: паводле статыстыкі, дынаміка станоўчая. Не памятаю зараз дакладныя лічбы, але сірот становіцца меней. А што тычыцца самой праблемы сіроцтва, то яна ёсць і будзе. Бо гэта жыццё. І вакол людзі. А людзі розныя.

І грамадскасць, у тым ліку наш фонд, заўсёды будзе гэтай праблемай займацца. І мы заўсёды будзем імкнуцца не толькі дапамагчы, не толькі навучыць дзіця хадзіць, гаварыць, потым працаваць… Мы будзем імкнуцца, каб нашы дзеці ведалі родную мову, паважалі бацькоў і шанавалі Радзіму.

Гутарыла **Кацярына ТРАФІМАВА.**

СПАДЧЫНА

…І ажыве 450-гадовая гравюра

Гравюра Маціяса Цюнта паводле малюнкаў Ганса Адэльгаўзера была надрукавана ў 1568 годзе ў Нюрнбергу. Яна прысвечана падзеям 1567 года, калі кароль Рэчы Паспалітай і Вялікага Княства Літоўскага Жыгімонт Аўгуст прымаў у Гродне адразу чатыры пасольствы: з Масковіі, Турцыі, Асманскай імперыі і Валахіі. Памер гравюры 36 на 102 сантыметры.

У свеце захавалася ўсяго некалькі асобнікаў. У 2008 годзе беларусы спрабавалі набыць гравюру на аўкцыёне ў Польшчы, аднак канчатковы кошт (больш за 40.000 долараў) перавысіў фінансавыя магчымасці. Таму, на жаль, арыгінала ў Беларусі няма.

За стварэнне дакладнай копіі гравюры для Гродзенскага гісторыка-археалагічнага музея ўзялася студыя imago.by.

– Адсканаваныя выявы тых асобнікаў, што захаваліся ў розных архівах свету, будуць зведзены ў адну, каб аднавіць клішэ, з якога панарама друкавалася, – расказвае менеджар праекта Валянціна Андрэева. – *Гравюра будзе надрукавана ўручную на паперы, якая адпавядае XVI стагоддзю, з дапамогай друкарскага прэса.*

Акрамя таго, яшчэ адзін асобнік будзе расфарбаваны мастаком у адпаведнасці з традыцыяй расфарбоўкі старадаўніх выяў, а пасля перавыдадзены паліграфічным спосабам. Плакат з панарамай сярэдневечнага Гродна з'явіцца ў крамах, і кожны зможа набыць яго па даступным кошце.

Трэба адзначыць, што сродкі на рэканструкцыю гравюры арганізатары праекта спадзяюцца сабраць з дапамогай краўдфандынгавай кампаніі "Анёлы над Гародам".

Святлана СУМАВА.

СТОП-КРАН

Беларускай электраэнергіі закрываюць шлях у Еўропу?

Літва збіраецца ў 2020 годзе дэманціраваць самую магутную ў Еўропе лінію электраперадачы, якая злучае гэтую краіну з Беларуссю.

Як заявіў міністр энергетыкі Літвы **Жыгімонтас Вайчунас**, такім чынам Літва хоча забараніць экспарт электраэнергіі з БелАЭС у Еўрасаюз. Маркуецца рэканструяваць дзве падстанцыі ў паўночна-ўсходняй частцы Літвы і дэманціраваць ЛЭП 750 кілавольт, якая вядзе ў Беларусь. Кошт праекта – 30 мільёнаў еўра.

Дарэчы, у адрозненне ад Літвы Латвія не адмовілася ад экспарту электраэнергіі з Беларусі.

Віктар ШПАК.

ІНІЦЫЯТЫВА

Аўкцыён ладзіць мастак Купава

Сёння на сядзібе Партыі БНФ знакаміты мастак Мікола Купава ладзіць аўкцыён. Такая падзея ў сталіцы ўвогуле не частая, а ў штаб-кватэры палітычнай партыі тым больш. У чым тут справа?

– Нашаму аргкамітэту па правядзенні мерапрыемстваў да 100-годдзя БНР не хапае сродкаў. Так, галоўнае свята прайшло, але ёсць планы на будучыню. Калі некаторыя малюнкі з аргкамітэта адышлі ад Партыі БНФ (думалі зрабіць у горадзе "рэвалюцыю" – шэсцем прайсці па праспекце), то забралі з агульнай касы свае грошы. Я нікога не асуджаю: ну, пайшлі і пайшлі. Але нам зараз трэба пагасіць доўг перад выдавецтвам за надрукаваныя партрэты дзеячаў БНР, нам трэба працаваць. Таму я буду прадаваць свае працы, каб пакрыць доўг, – распавёў мастак Купава, выканаўчы старшыня аргкамітэта па святкаванні 100-годдзя БНР.

Кірыл БУБНОЎ.

КРОПКІ НАД "І"

Цымбалы падарыла Вікторыя Машлякевіч, а не арганізатары Дня Волі

Гэта ж трэба, на адным сайце з'явілася недакладная інфармацыя і пайшла "гуляць" па многіх СМІ. Паводле першапачатковага паведамлення "Нашай Нівы", цымбалы Насці Ванеевай, удзельніцы расійскага тэлешоу "Лучше всех", якая навучыла вядучага Максіма Галкіна правільна вымаўляць назву нашай краіны, падарылі арганізатары Дня Волі. Аказалася, што такі дабрачынны жэст зрабіла мінчанка **Вікторыя Машлякевіч,** якая не мае ніякага дачынення да арганізатараў святкавання Дня Волі. "Ужо 12 гадоў, як я скончыла музычную школу. Увесь гэты час цымбалы ляжалі без справы, але я не хацела іх прадаваць – захоўвала як памяць. Убачыла відэа перадачы з удзелам Насці, вельмі спадабалася, як яна іграе, і вырашыла падарыць ёй інструмент. Спадзяюся, мае цымбалы зажывуць другім жыццём і доўга будуць радаваць усіх нас цудоўнай музыкай. Зычу Насці поспехаў!" – патлумачыла свой учынак Вікторыя Машлякевіч.

С МОЕЙ КОЛОКОЛЬНИ



Елена МОЛОЧКО

Младенцы на помойке

Есть существа, пожирающие человеческую плоть. Они людоеды. Есть женщины, умерщвляющие своих новорожденных детей. Этих самок без материнского инстинкта человечество даже не придумало, как назвать. Разве что ведьмами?

Вот в Белыничах аккурат накануне Пасхи возле теплотрассы нашли тельце новорожденного ребенка. Вы вздрогнули от ужаса? Возможно, и нет. Несколько раз в год мы читаем такие сообщения, острота восприятия уже немного стерлась. Да и слово «теплотрасса» как-то мимо воли смягчает картину. Не в навозе же, не в выгребной яме, как часто бывает, не в канализации, не в мусорном бачке оказался младенец после рая материнского чрева, а у «тепло-трассы».

Но тепла ему там, конечно, не хватило, обольщаться не надо. Холодное тельце новорожденного сейчас изучают эксперты, устанавливают точную причину смерти. Может быть, младенец был мертворожденным? Хотя чаще всего такие нелюди их хладнокровно умерщвляют самостоятельно. Избавляются, как от мусора. У них в утробе это… как грязь. А что в голове? Тоже, конечно, грязь, темное месиво. Сначала эти самки не предохраняются, а вдруг (!) забеременев, не идут даже на аборт. Они будто бы специально вынашивают свой плод девять месяцев, чтобы потом, претерпев святые муки родов, выбросить на помойку полноценное дитятко.

Какое кощунство!..

И – где логика? Когда разрешены аборты, когда свободно продаются контрацептивы? Ну, о морали говорить здесь просто неуместно. Да и кому говорить? Такие существа к понятиям «грех» и «нравственность» глухи и равнодушны. Они не боятся мук совести. Преступниц довольно часто находят, их карают лишением свободы сроком на 5 лет, но ребенка-то не вернешь… Но что неоспоримо: во все века самки подобного толка боялись огласки. Они действуют тайно, рожают в туалете, в кустах, в оврагах. А потом несут плод… У нас – на помойку. В Европе тоже тайно, но – в специализированные приемники, так называемые бэби-боксы. В «коробках жизни» тоже не все идеально складывается, но шанс на выживание у новорожденных все-таки есть.

Еще в средние века при церквях для подкидышей существовало в Европе «колесо жизни», вращающееся в горизонтальной плоскости. Очень давно я видела такое в старом храме древнего Рима, экскурсовод специально подвел нас к уникальному «экспонату». А оказалось вечное изобретение. Ребенка клали в него, как в ячейку, и он, совершив поворот, попадал в приют, к монахиням. А женщины, оповестив о передаче звонком, убегали. В конце XIX века эта практика в Европе была прекращена. Но подкидыши-то не исчезли. Потому что в любом обществе всегда есть процент морально неполноценных людей. Призывать их к цивилизованному решению проблемы нежелательной беременности бесполезно. Они глухи. И новорожденные в Европе стали погибать сотнями.

И через сто лет там вернулись к древнему «колесу жизни» – теперь они стали называться бэби-боксами, инкубаторами. Это, по-простому говоря, ящики в стене специального учреждения для малюток. Там всегда поддерживается оптимальная температура. Ящик открывается всего на 30 секунд. Если кто-нибудь кладет ребенка внутрь, сигнал об этом тут же получают социальные работники, которые дежурят круглосуточно. Через несколько минут они забирают младенца.

Главное – нет камер наблюдения, всем гарантируется анонимность. И для отказниц это играет определяющую роль. Ну и пусть скрываются, их ведь уже ничем не исправишь. Но протянуть руку, да нет, мизинец помощи, чтобы эти существа хотя бы не становились ведьмами-детоубийцами, наш социум может все-таки себе позволить. Потому что отказаться от своего ребенка – это не смертный грех, а трагедия твоей собственной жизни. А отнести сверток с глотнувшим земного воздуха дитем на «сметнік» – это чудовищная жестокость, которая, конечно, карается небом и людьми.

И вот перед нашим обществом давно стоит дилемма: проявить милосердие к новорожденным (именно к новорожденным!) и все-таки организовать их анонимный прием, чтобы дать шанс на жизнь, или высокомерно, лицемерно и шаблонно сотрясать воздух рассуждениями о морали, материнстве и социальной ответственности? Но перед кем мечем бисер красивых слов? Перед теми, кто по уровню нравственного развития до сих пор остался в пещере, кто не в силах освоить христианскую заповедь «не убий»? Для кого материнство – наказание, а потому выродила – выбросила? А если будут существовать у нас бэби-боксы, некоторые обязательно донесут свой плод до «коробки жизни».

А пока надежда на наступающее лето, на Божье тепло. Оно, наверное, спасет – единицы нежеланных новорожденных. Но большинство опять погибнет. Как говорится, следите за новостями.

ЗЕМЛЯКІ

За 6000 кіламетраў ад радзімы

Як жывуць беларусы Прыбайкалля

Роўна 23 гады таму ў іркуцкай газеце "Советская молодежь" была надрукавана даволі незвычайная аб'ява. З заклікам "Сябры-беларусы!" да сваіх землякоў звяртаўся Алег Рудакоў. Прапанова была да банальнага простая: сустрэцца, пазнаёміцца і аб'яднацца. Уласна кажучы, з гэтай маленькай публікацыі і пачалася вялікая гісторыя Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага.

***"Чым займаўся да гэтага? Выжываў, гандляваў кнігамі… У 26 гадоў мяне, афіцэра, звольнілі з арміі па стане здароўя. Без права на пенсію"*, – раскажа мне потым Алег Рудакоў. Таварыствам беларусаў кіраваў цэлых 17 гадоў, пасля чаго... пачаў усё з чыстага ліста. Чаму так атрымалася – тлумачыць неахвотна. Ды і які сэнс? Цяпер у Рудакова новы брэнд – Іркуцкі беларускі клуб "Крывічы". І людзі да яго па-ранейшаму прыходзяць не таму, што трэба, а таму, што цікава: вучыць мову, спяваць народныя песні, займацца традыцыйнымі рамёствамі і ствараць сваю Беларусь. Хай сабе і за 6000 кіламетраў ад радзімы.**



"Калі знаходзішся ў Мінску, няма розніцы – скажаш ты "бульба" ці "картошка", праўда? А вось у Іркуцку толькі зямляк зразумее, што "бульба" – гэта па-нашаму", – тлумачыць мне нюансы сваёй сібірскай настальгіі заснавальнік беларускай дыяспары.

– Я нарадзіўся на Полаччыне, у вёсцы Бяздзедавічы. Але пасля школы мне чамусьці прыйшло на думку паехаць у Сібір, павучыцца ў ваеннай вучэльні. Цюмень, Каракумы, Чыта і нарэшце Іркуцк. Па шчырасці, не думаў, што ўсё так зацягнецца. Страшна падумаць: у Прыбайкаллі я ўжо 33 гады.

– І ніколі не цягнула дахаты?

– Яшчэ як цягнула! І дня не мінала, каб я ў марах не вяртаўся ў Беларусь.

– Можа, менавіта таму ў вас і атрымалася стварыць у Сібіры не проста суполку, а сапраўдны рух, цэлую грамаду!

– А цяпер уявіце: калі ў 1995 годзе мы ладзілі першую сустрэчу, па-беларуску размаўляў толькі я. Увогуле, спачатку ніхто не разумеў, чым нам варта займацца. Адзін казаў: давайце на паляванне хадзіць разам. Другі: на рыбалку. Але аказалася, што прасцей за ўсё яднацца на глебе нацыянальных традыцый. Цяпер на тое ж Купалле да нас з усёй акругі едуць. І не толькі беларусы.

«Я беларус, але нікому пра гэта не скажу»

– Якімі вятрамі заносіла ў Іркуцк нашых людзей?

– Багата беларусаў пераехала ў Сібір падчас сталыпінскай рэформы: у пошуках лепшай долі перабіраліся цэлымі родамі, вёскамі. Нямала ссылалі людзей у 1930-я гады, пасля Другой сусветнай вайны. Сёння ў Сібір беларусы масава не едуць. Апошняя хваля перасялення была пасля вываду ракетных войскаў. Шмат хто з беларускіх афіцэраў хацеў даслужыць, і часцей за ўсё людзям прапаноўвалі менавіта Іркуцкую вобласць.

– І колькі там сёння жыве беларусаў?

– У Іркуцку – прыкладна 7000, у вобласці – каля 50.000 чалавек. Але гэта афіцыйныя лічбы. Паводле ж маіх даследаванняў, у Прыбайкаллі кожны трэці – беларус. Бо які тут сакрэт: мясцовыя ўлады ў аддаленых вёсках увогуле не праводзяць ніякіх перапісаў, а проста запісваюць беларусаў рускімі.

– Але ж і нашы людзі, я так разумею, не б'юць сябе ў грудзі.

– На жаль, у асноўным філасофія нашага чалавека за мяжой такая: "Я ведаю, што я беларус, але нікому пра гэта не скажу". Мы занадта хутка асімілюемся ў іншамоўным асяроддзі. Паглядзіце на нашых суседзяў: тыя ж украінцы – як яны сябе паказваюць! Два ўкраінцы за мяжой – гэта ўжо суполка. А беларусы сустрэліся, пазнаёміліся і разышліся.

– Няпроста вам гуртавацца…

– Таму я і кажу, што чалавек, які да нас дайшоў, – ужо свядомы. Хай сабе ён не будзе ведаць мову, гісторыю – мы навучым. Галоўнае, што яго пацягнула. Смешна сказаць, але мы да сёння сустракаем у Іркуцку беларусаў, якія ведаюць пра наш клуб, бачаць нас па тэлебачанні, чуюць па радыё, але іх псіхалогія такая: вы малайцы, што гэтым займаецеся, але ў нас на гэта часу няма. Беларусаў вельмі, вельмі цяжка разгайдаць.

– Ну, гэта не толькі ў Сібіры. Дарэчы, якія вашы меркаванні наконт тыповых нацыянальных рыс?

– Сапраўдны беларус ніколі не пазычыць грошай, пакуль не даведаецца, што ты за іх будзеш купляць *(смяецца)*. А калі сур'ёзна, беларусы вельмі добразычлівая нацыя. Часам занадта. Бывае, нам і самім гэта не дужа выгадна, але мы зробім усё, каб госцю было добра.

– А як жа вядомая кожнаму школьніку "талерантнасць"?

– Толькі не ў сэнсе "цярпімасць", а талерантнасць як разуменне. Як вялікая павага да другой культуры, традыцыі, да другога чалавека. Павага і жаданне "не перашкаджаць".

– Але людзі бываюць розныя…

– І нахабныя, і лянівыя… Я згодны. Але ўсё ж такі нейкія стэрэатыпныя беларускія рысы існуюць, і іх нікуды не дзенеш. Нават у Сібіры. Мой выкладчык па ваеннай псіхалогіі заўсёды казаў: "Беларуса можна смела пакідаць на самых адказных пазіцыях, бо, калі ён паабяцаў, што зробіць, – значыць, зробіць".

Да жыцця – па-філасофску

– У Сібіры вы аб'ездзілі дзясяткі, калі не сотні вёсак беларускіх перасяленцаў. На сяле асіміляцыя адбываецца павольней, чым у горадзе?

– Нашу вёску пазнаеш адразу: заўсёды ёсць галоўная прамая вуліца. Праз кожныя шэсць хат – абавязковы правулачак. Усё паралельна і перпендыкулярна, як арнамент на беларускім ручнічку. Вокны абавязкова выходзяць на вуліцу, між хатай і вуліцай – палісаднік, дзе растуць альбо кветкі, альбо дрэва. У асноўным – чырвоная рабіна. Дарэчы, мне некалі беларускія старажылы казалі, што чырвоную рабіну нашы продкі прывезлі з сабой. Яна дрэва-абярог, забірае ўсю кепскую энергію і дае станоўчую. Так што яе можна смела называць беларускім сімвалам. А вось у расійскіх вёсках вы часцей заўважыце бярозку. Увогуле, бураты будуюцца больш стыхійна, вуліцы ў іх пераважна крывыя, бо дамы ставяцца як бог на душу пакладзе.

– Гаспадараць людзі таксама па-рознаму?

– У сібірскіх вёсках толькі беларусы садзяць бульбу пад плуг, у барозны. Мясцовыя – выключна пад лапату. Прычым не ў радочак, а ці то колам, ці то ў шахматным парадку. Потым так і капаюць – віламі трошкі паддзенуць, рукамі тую ямку разграбуць і дастаюць бульбу.

– Але ж гэта няспрытна!

– Я вам больш скажу. У бурацкіх сёлах скаціна выходзіць на двор і летам, і зімой. Іншы раз едзеш, мароз 35 градусаў, снегу намяло – а на полі статак коней. І ні пастуха, нікога няма. Я раней проста дзіву даваўся: "А раптам увечары карова не прыйдзе?" "Піць захоча – вернецца", – адказваюць. Карацей, вельмі па-філасофску ставяцца да жыцця. Нават сена на зіму не нарыхтоўваюць. А вось беларусы гэтых мясцовых звычак так і не перанялі.

Трэцяе пакаленне

– Спадар Алег, з "Крывічамі" шчыруеце не толькі ў Іркуцку?

– У тую ж Тургенеўку, што за 140 кіламетраў на поўнач, мы пастаянна ездзім калядаваць. Там увогуле вельмі актыўная беларуская суполка. Скажам, мясцовай настаўніцы фізкультуры я дапамог з матэрыялам, і цяпер на сваіх занятках яна вывучае з дзеткамі народныя танцы. У школе ёсць факультатыў па беларускай мове, і вы б толькі паслухалі, з якім задавальненнем малыя там шчабечуць па-беларуску! Я заўсёды дзіву даюся, бо бацькі іх збольшага размаўляюць па-расійску альбо на трасянцы: за савецкім часам вучылі ж "правільна" размаўляць. Але дзеткам спатрэбіўся толькі адзін маленькі штуршок – і калі ласка, яны ўжо сапраўдныя беларусікі! Ну і як тут не паверыць, што і сапраўды існуе нейкі генетычны код?

– Часта пра гэта разважаеце?

– Недзе я прачытаў, што толькі шостае пакаленне перасяленцаў губляе генетычную памяць. І толькі пры ўмове, што ўсе пяць папярэдніх не мелі магчымасці прыехаць на гістарычную радзіму, не чулі роднай мовы і не зносіліся з землякамі. Я думаю, так і ёсць. Бо да нас прыходзяць людзі, якія нарадзіліся ў Сібіры ў другім, у трэцім пакаленні, і ім ніколі ніхто не расказваў, што яны беларусы. І раптам з'яўляецца сапраўднае жаданне даведацца пра сваю мову, культуру, карані. Ну вось адкуль гэта?

Стан свядомасці

– Як у век інтэрнэту ды віртуальных зносін у вас атрымліваецца згуртаваць столькі моладзі?

– Усё вельмі проста: у нас няма гледачоў. Толькі ўдзельнікі. Бывае, з іншых рэгіёнаў мне жаляцца: не можам сабраць беларусаў. Я пытаюся: "А як вы ладзіце сустрэчы?" – "Ну, збіраемся, стол накрыем, узгадаем, хто дзе нарадзіўся, вырас, каго памятае…" Але што моладзі там рабіць? Ну раз чалавек паслухае, другі… А вось калі ён сваімі рукамі зробіць сабе строй, патанчыць, паспявае, пакалядуе – гэта ж іншая справа. Ведалі б вы, якія ў нас на Каляды спрэчкі бываюць! Ніяк не могуць вырашыць, хто Казой будзе, а хто Мядзведзем.

– Але, што б вы ні казалі, усё роўна гэта вялікі талент – аб'ядноўваць людзей.

– Ведаеце, самае галоўнае – не баяцца. Заўсёды знойдуцца тыя, каму гэта будзе цікава. Напрыклад, у нашым клубе ёсць заняткі па беларускай мове. Мы спачатку думалі: будуць вучыцца толькі самыя актыўныя. Але людзі прыходзяць літаральна з вуліцы – проста так, для сябе.

– І пра што тады думае самы вядомы беларус Прыбайкалля Алег Рудакоў?

– Я думаю пра тое, што, дзе б мы ні жылі, мы мусім памятаць пра свае карані, вучыць гісторыю свайго народа, шанаваць матчыну мову і абавязкова мець традыцыйны беларускі строй ды не саромецца апранаць яго на святы. З усяго гэтага і нараджаецца стан унутранай свядомасці, гонар, што ты – Беларус.

Аліна СТРАШКЕВІЧ.

ЗА РУЛЕМ

Какие кредиты на покупку новых машин предлагают белорусские банки?

В первом квартале этого года белорусы купили почти 9 тысяч новых автомобилей в салонах. Среди самых популярных марок – Renault, Volkswagen, Lada, Nissan. Эксперты говорят, что если такие темпы продаж сохранятся, то новых машин в Беларуси будет продано не меньше, чем в прошлом году: тогда эта цифра составила 34.255 автомобилей.

Кстати, белорусско-китайские Geely тоже попали в десятку наиболее покупаемых машин. Их в первом квартале 2018 года продано 170. Это, к слову, десятый показатель в рейтинге продаваемости. Но представители автокомпании надеются на существенный рост продаж. Как известно, с конца марта стартовала кредитная программа на покупку Geely для юридических лиц. Условия невероятно выгодные. Кредиты выдаются на сумму до 50% от стоимости авто, а также до 70%, до 80% и даже до 90% от стоимости автомобиля. Процентная ставка – 1,9 (!) процента первые 3 года для кредитов, которые составляют до 75% от стоимости авто и 2 года, если кредит выдан на сумму до 90% от стоимости автомобиля. И только по истечении этого срока процентная ставка возрастает до 13 процентов. Выдает кредиты «БПС-Сбербанк».



А на каких условиях банки страны выдают кредиты на покупку новой иномарки? Недавно аналитики специализированного интернет-ресурса Bankchart исследовали условия предоставления таких автокредитов сроком на 5 лет в национальной валюте. Выяснилось, что предоставляют их 14 банков. Средняя реальная ставка – 14,92% годовых.

К СЛОВУ

В Польше – от 3% до 5% годовых…

В соседней Польше уже давно ставки по кредитам на покупку новых автомобилей весьма незначительные. Разные банки имеют разные кредитные программы, но в среднем ставка составляет 3–5% годовых. Первый взнос при покупке новой машины в кредит может начинаться от 15% стоимости машины. В Эстонии автокредиты предлагаются еще на более выгодных условиях: в среднем под 2,5% годовых с обязательным первоначальным взносом в размере 10% от суммы приобретаемого в салоне автомобиля.

Что касается кредитных программ в России, то предложения на приобретение машины почти всех банков похожи и имеют практически равные условия. В большинстве случаев процентная ставка составляет от 12% до 15% годовых.

Ольга ГРИНЕВИЦКАЯ.

№	Банк	Реальная ставка, %	Разовая комиссия	Ежемесячная комиссия	Аванс
1	«Цептер Банк». Автокредит Jeep	8,99	Нет	Нет	От 10,00%
2	«БТА Банк». Автокредит Hyundai-Минск (Вариант 3)	9,99	Нет	Нет	От 40,00%
3	«БПС-Сбербанк». «Главная дорога со Сбербанком и Lada»	12	Нет	Нет	От 0,00%
4	«БНБ–Банк». Программа кредитования Changan	12,55	Нет	Нет	От 10,00%
5	«Беларусбанк» Кредит на приобретение автомобиля	13,5	Нет	Нет	От 0,00%
6	«Технобанк». «Поехали! С ООО «ВитебскАвтоСити»	14	Нет	Нет	От 30,00%
7	«Белинвестбанк». На приобретение нового автомобиля марки Skoda	14,5	Нет	Нет	От 20,00%
8	Банк «Москва–Минск». Партнерская программа на автомобили HYUNDAI	14,8	Нет	Нет	От 0,00%
9	Банк «Решение». Автокредит «Комфортный»	15	Нет	Нет	От 30,00%
10	«Приорбанк». Кредит на новый автомобиль	15	Нет	Нет	От 20,00%
11	Банк «БелВЭБ». «Сваё аўто»	15,1	Нет	Нет	От 0,00%
12	«Паритетбанк». «АвтоШанс»	15,5	Нет	Нет	От 0,00%
13	«Франсабанк». На приобретение нового автомобиля	16	Нет	Нет	От 20,00%
14	«Белагропромбанк». Автокредитование	17,05	45,00 руб.	Нет	От 30,00%

СУДЬБЫ

Не поле перейти

Сколько их осталось, старых минчан, потомков минской интеллигенции, которые еще хорошо помнят довоенный Минск? Из этих немногих Лилия Иосифовна Брандобовская, чье 90-летие недавно отметили и визитами к ней, и звонками, и добрыми словами в «Фейсбуке» ее друзья. А друзей, слава Богу, у Лилии Иосифовны немало. Особенно в журналистской, актерской, художественной среде. Жизнь она прожила по всем меркам невероятно большую, богатую встречами. Но и горечи, тяжких испытаний в этой жизни было через край. Когда Лиле было четыре года, ее родителей арестовали. Сидели они в известной «американке» вместе с белорусскими учеными и писателями, которых обвиняли в националистическом заговоре. Дочь «врагов народа» выгнали из детского сада, квартиру отобрали, и она скиталась по родственникам. Начало 1930-х годов было еще, как говорила Ахматова, временем вегетарианским, и спустя год родителей выпустили. Но в семье продолжали ожидать худшего.



В июне 1941 г. из пылающего и рушащегося Минска они пошли в сторону Городища. Мама держала на руках двухмесячную Риту, 13-летняя Лиля вела за руку шестилетнего Мишу. Оставшаяся в городе бабушка, еврейка, была обречена. В Куйбышеве Лиля пошла в вечернюю школу, поскольку днем, до прихода матери, нужно было заниматься братом и сестрой. А о занятиях на фортепиано, когда она училась в минской музыкальной школе, пришлось забыть. И все-таки школу она закончила с серебряной медалью. Лиля очень хотела учиться в Московском университете, но не получилось, в том числе, вероятно, из-за «пятого пункта» в анкете. Но девушка не сдалась. Начала учиться в так называемом экстернате, сданные там экзамены и зачеты позволили поступить в другой вуз, что она и сделала вскоре, вернувшись в Куйбышев, где стала студенткой педагогического института. А через два года уже в Минске поступила на филологический факультет Белорусского университета. Училась вместе с Алесем Адамовичем, Наумом Кисликом, Александром Коршуновым. И все-таки заканчивать пришлось педагогический.

Работать начала корректором в редакции газеты «Знамя юности». И однажды удивила сотрудников своими впечатлениями от театрального спектакля. Ей сказали:

– Напиши!

И вот с 1958 г. в минской, а затем и в московской периодике стало появляться имя Лилии Брандобовской, своеобразного и тонкого театрального критика. Ее статьи и рецензии печатались в газетах «Літаратура і мастацтва», «Труд», «Советская культура», в журнале «Театр». Конец 1950-х – начало 1960-х годов – время надежд, отразившееся и на театре. Время становления замечательных артистов и режиссеров, чьи портреты создает Лилия Брандобовская в серии очерков. Благодарная актерская среда ждет ее на премьерах. Она дружит с Ростиславом Янковским, с Владомирскими, с легендарной Верой Павловной Редлих. Среди ее друзей известные писатели и журналисты Валентин Тарас, Александр Дракохруст, Ирина Климашевская, Самсон Поляков, театровед Татьяна Орлова, художник Стасис Красаускас.

Знаком судьбы стала ее встреча с Владимиром Бойко. В интернете о нем сказано: журналист, сценарист, поэт, искусствовед. И надо всем этим доминирует: Интеллигент. Он не просто принадлежал к вымирающему ныне сословию. Он был лицом, образцом лучшей части белорусской интеллигенции. Высочайшая культура при безусловной порядочности и доброжелательности и одновременно готовности поддержать человека, творить добро и противостоять предательству и подлости – таковы были главнейшие черты духовного облика Владимира Андреевича. Если бы он жил в эпоху Возрождения, наверняка проявил бы себя в разных искусствах, так многогранно одарила его природа. Но и в то нелегкое время, что выпало на его долю, он сумел стать замечательной личностью – писал картины и искусствоведческие работы, читал лекции и выступал по радио. И был верным другом. Конечно, в первую очередь для Лилии Брандобовской. Это была замечательная пара, в квартире которой не остывала атмосфера дружества и культурных интересов. Бойко дружил со многими художниками и писателями. Особо хочется выделить его дружбу с Алесем Адамовичем, он оставил нам замечательные статьи о его творчестве.

Уже более двадцати лет, как ушел из жизни Владимир Бойко. За четыре года до смерти он написал эти строки:

Кроў з нашых жылаў – не вадзіца...
Душа дашчэнту зруйнавана.
І тая высахла крыніца,
Што загаіла б сэрца раны...

Наскрозь прасякнуты маною
Дажджы прыгожых слоў адвеку
І над табой, і нада мною...
Я не суддзя, я сведка веку...

И судьба Лилии Иосифовны видится в контексте этого мудрого и трагического признания. Но она не только свидетель века. Она сохранила тепло и душу их совместного с Владимиром Бойко дома. Потому и тянутся к ней до сих пор люди разных возрастов.

Семен БУКЧИН.

РЭГІСТРАТУРА

Больш за палову выпускнікоў застаюцца ў Мінску

У Беларускім дзяржаўным медуніверсітэце прайшло размеркаванне выпускнікоў.

Што характэрна: больш за палову будучых урачоў, якія скончылі лячэбны факультэт БДМУ, застаюцца працаваць у Мінску – 157 чалавек. 81 адпраўляецца працаваць у Мінскую вобласць, 28 – у Брэсцкую, 6 – у Гомельскую, 12 – у Гродзенскую, 23 – у Магілёўскую, 8 – у Віцебскую.

Другі момант, які звяртае на сябе ўвагу, – вельмі мала выпускнікоў платных аддзяленняў захацелі ўзяць дакумент аб свабодным працаўладкаванні. На лячэбным факультэце такіх толькі трое, крыху больш на стаматалагічным аддзяленні.

Мінск, як вядома, найбольш востра мае патрэбу ва ўрачэбных кадрах. Апошняя статыстыка аб свабодных урачэбных вакансіях у сталіцы – патрабуецца 441 урач-спецыяліст. Нават у вядучых клініках не хапае вузкіх спецыялістаў. Напрыклад, на галоўнай старонцы сайта 2-й клінічнай бальніцы Мінска адна з галоўных навін, якая трымаецца ўжо доўгі час, – «Адкрыты вакансіі». Бальніца запрашае на працу больш за 20 вузкіх спецыялістаў: отарыналарынголага, неўролага, кардыёлага, анколага, алерголага і г.д. Зразумела, што такая сітуацыя выклікана тым, што 2-й бальніцы аддалі плошчы былой лечкамісіі, і тут ствараюцца новыя аддзяленні. Тым не менш ужо працяглы час жадаючых уладкавацца на працу ў сучасную клініку, якая месціцца ў цэнтры Мінска, няма. Хаця некатораым спецыялістам прапаноўваецца і не такі ўжо малы па сённяшніх мерках заробак – за працу ў адну змену і 1000 рублёў (хірург), і 900 (кардыёлаг, урач ультрагукавой дыягностыкі).

Цікава, што за апошнія 10 гадоў колькасць выпускнікоў медыцынскіх ВНУ краіны зрачна ўзрасла: у 2005 годзе дыпломы атрымалі 1600 студэнтаў, а ў 2018-м – 2899. А ўрачоў у краіне ўсё роўна не хапае.

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

ЧУЛІ?

Гродзенскую семінарыю ўзначаліў 38-гадовы ксёндз

Гродзенская вышэйшая духоўная семінарыя будзе рэарганізавана ў Міждыяцэзійную вышэйшую духоўную семінарыю. А рэктарам рэарганізаванай установы будзе ксёндз **Віталь Вайцяхоўскі**.

Святару 38 гадоў, ён нарадзіўся 9 кастрычніка 1979 года ў Астравецкім раёне Гродзенскай вобласці. Вывучаў тэарэтычную філасофію ў Люблінскім каталіцкім універсітэце (Польшча). З 2011 года выкладае ў вышэйшай духоўнай семінарыі ў Гродне. З'яўляецца пробашчам парафіі Святога Антонія і Богаяўлення ў Камянцы і адміністратарам парафіі Найсвяцейшай Тройцы ў Дзембраве.



Дарэчы, духоўная семінарыя ў Гродне была заснавана 1 верасня 1990 года мітрапалітам Мінска-Магілёўскім Тадэвушам Кандрусевічам, які, дарэчы, сам родам з Гродна. На працягу шасці апошніх гадоў семінарыя рыхтуе выпускнікоў да пасвячэння ў святары і за гэты час падрыхтавала больш за 150 святароў, якія сёння служаць у Беларусі, ва Украіне, у Расіі і Казахстане.

Ігар ЗАЛЕСКІ.

СТЫЛЬ



Анастасія ФАЛЬКОВІЧ, дызайнер адзення:

«Вяселле ў нацыянальным стылі – гэта модна, актуальна, запатрабавана»

У дзяцінстве яна любіла залезці ў бабулін куфар, які захоўваўся на гарышчы вясковай хаты пад Ракавам. Захапленне льном, вышыванкай стала вызначальным у выбары прафесіі. Сёння ў дызайнера Анастасіі Фальковіч кожны чацвёрты заказ – выраб у нацыянальным стылі. Кліенты Анастасіі – вядомыя артысты, палітыкі, дыпламаты і... звычайныя беларусы.

– Цікавасць у грамадстве да этна-стылю асабліва ўзрасла ў апошнія чатыры гады, – *адзначае Анастасія Фальковіч.* – Нацыянальная тэма сёння актуальна. Многія артысты, выступаючы на дзяржаўных канцэртах, імкнуцца выкарыстаць у сваіх строях менавіта нацыянальныя матывы, беларускі арнамент. Хутка, напрыклад, «Славянскі базар» у Віцебску, і мне паступаюць ужо заказы ад нашых зорак на беларускія строі.

Мае касцюмы ёсць у Вікторыі Алешка, Жанет, Зоі Белахвосцік, Аляксандра і Валянціны Гарцуевых. Зараз распрацоўваю новы вобраз для групы «Спадчына», гурта Pawa, з якім рыхтуем унікальны праект, звязаны з нашай культурай. Шмат хто з тэлевядучых заказвае адзенне, а таксама дзяржаўныя дэлегацыі. Заказваюць сукенкі для паказаў нашы прыгажуні, якія прадстаўляюць Беларусь на міжнародных конкурсах прыгажосці. Нядаўна зрабілі заказ для вядучай заслужанага калектыву Рэспублікі Беларусь Дзяржаўнага акадэмічнага ансамбля танца Беларусі.

21 красавіка ў Нацыянальнай школе прыгажосці пройдзе чарговы фестываль-конкурс беларускай моды і мастацтва "Этна-стыль", які збярэ вядомых беларускіх дызайнераў. Маю калекцыю «Шляхта» прадставяць Вікторыя Алешка, Жанет, тэлевядучая Паліна Шуба, Вольга Сацюк, Андрэй Усанаў, Андрэй Бонд, Аляксандр Серыкаў.

– Як атрымалася займець такіх кліентаў? Гэта ж свайго роду рэклама вашай працы?

– Спачатку некалькі касцюмаў у этна-стылі пашыла бясплатна, гэта была такая прэзентацыйная акцыя. Строі заўважылі, сталі звяртацца з новымі заказамі, і пайшло-паехала. Сёння заказаў столькі, што чарга на месяцы расцягваецца.

Часта звяртаюцца беларусы, якія з'ехалі з краіны і сумуюць па радзіме, па беларускай культуры. Апошні такі заказ нядаўна адправіла ў Каліфорнію.

– Звычайныя беларусы робяць у вас заказы?

– Вядома ж. Зараз робім вельмі шмат вясельных убораў у нацыянальным стылі. Гэта модна, актуальна, запатрабавана. Вельмі часта заказваюць вопратку ў нацыянальным стылі для дзяцей. Адзенне з нашага лёну вельмі зручнае і ў спякоту, гіграскапічнае, нягледзячы на тое, што лён мнецца.

– Але ж гэта, напэўна, нятанна?

– Па-рознаму. Усё залежыць ад якасці тканіны, пажаданняў... Вясельная сукенка нявесты можа каштаваць 350 рублёў, а можна і ў тысячу не ўпісацца. Жаніхі звычайна заказваюць кашулю-вышыванку альбо жупан. Прычым, адзначу, далёка не ўсе пары беларускамоўныя. Але сёння ўсё больш маладых людзей атаясамліваюць сябе з Беларуссю, ім падабаюцца нашы традыцыі, ім хочацца зрабіць не проста вяселле, а вяселле ў нацыянальным стылі. Таму ўсё стала досыць «трэндавым» – вышыванкі, беларускі арнамент, усякія модныя штукі з нацыянальнымі ўзорамі. Былі пары, якія заказвалі нацыянальныя ўборы і для сваіх гасцей. Часам маладыя людзі прыходзяць са сваімі прапановамі, мне толькі застаецца ўвасобіць іх у рэальнасць ....



– Каб паспець замовіць вясельную сукенку, калі трэба да вас звяртацца?

– Лепш месяцы за два, мінімум – паўтара. Інакш я не вазьмуся за справу, каб не падвесці кліента. Хаця заўсёды імкнуся ісці насустрач.

– Анастасія, заказаў у нацыянальным стылі больш, чым звычайных?

– Пакуль яшчэ не. Але кожны чацвёрты – гэта ўжо касцюм у этна-стылі, з нейкім нацыянальным прыбамбасам. Хутка адкрыецца крама майго аўтарскага адзення «Буцік Фальковіч», дзе можна будзе набыць строі ў нацыянальным стылі.

– Думаеце, справа пойдзе? Сёння нацыянальнае ў адзенні ўжо актыўна выкарыстоўваецца, канкурэнцыя на гэтым рынку вялікая…

– Згодна, немалая, але ў кожнага свая рука, свой почырк, свае кліенты.

А паколькі сярод маіх кліентаў шмат артыстаў, медыйных персон, ды і звычайных прыхільнікаў маёй творчасці, то я без працы не застануся. У іх заўсёды канцэрты, мерапрыемствы, падзеі…

І потым, часам не ведаеш, каго твае вырабы зацікавяць. Да мяне часта звяртаюцца высокапастаўленыя чыноўнікі, у тым ліку дыпламаты і прадстаўнікі беларускіх дыяспар за мяжой. Так, зімой адна з маіх сукенак паехала ў Карэлію, і ў ёй цяпер нашу нацыю прадстаўляе кіраўнік тамтэйшай беларускай дыяспары. Маім сталым кліентам быў пасол Арменіі ў Беларусі Армэн Хачатран, яго місія ў нашай краіне ўжо скончылася. Вядома, гэта і адказна, і вельмі прыемна. Так што наконт кліентаў, цьфу-цьфу, я не турбуюся. Я не займаюся мас-маркетам, у мяне эксклюзіўныя работы. Я шыю на канкрэтнага чалавека, мне важна, які ў яго характар, прафесія, колер вачэй, валасоў, асаблівасці фігуры. Кашалёк заказчыка мяне не цікавіць, калі я ствараю вопратку, я проста "варажу", і мне гэта падабаецца.

– Сваю першую працу ў нацыянальным стылі памятаеце? Як і чаму ўсё пачыналася?

– Чаму – зразумела. Беларускасць – яна ў генах. Я ў дзяцінстве шмат часу праводзіла ў бабулі. Гэта вёска Кісялі пад Ракавам Валожынскага раёна. Любіла лазіць на гарышча і капацца ў старых рэчах, якія захоўваліся ў бабуліным куфары. У асноўным гэта былі тканіны: лён, палатно, захоўвалася там спецыяльная дошчачка для рукадзелля – бабуля шмат вышывала, пляла з саломкі, таксама тады было модна плесці макрамэ з вяровачак. І я ўслед за бабуляй паспрабавала... Дарэчы, мая першая калекцыя ў этна-стылі так і называлася «Ракаўскі куфэрак».

А што тычыцца маёй першай дызайнерскай працы, калекцыі ў этна-стылі, – гэта была фотасесія вяселля ў народным стылі. Здарылася ўсё гады чатыры таму: проста захацелася паспрабаваць, мне гэта было цікава. А ўжо праз год тэма нацыянальнага, беларускага стала запатрабаванай у грамадстве, прычым ва ўсім – у адзенні, рэкламе, музыцы, літаратуры... І гэта цудоўна!

Марыя ЭЙСМАНТ.

На фота: адну з першых вясельных калекцый Анастасія Фальковіч пашыла для маладых з Гродна Вікторыі і Міхаіла Петрусевічаў.

Народная Воля
http://www.nv-online.info
13 КРАСАВІКА 2018 г.

ПЕРВЫЕ ЛИЦА

Европейский Плохиш с Дуная

…А ведь Европа так надеялась, что венгры одумаются и не поддержат Виктора Орбана. Но и на старуху бывает проруха. Партия одного из самых одиозных европейских правителей получила в парламенте конституционное большинство. Очереди на участках для голосования составила молодежь. Орбан торжествует победу.

Над могилой социализма

Виктор Орбан вошел в венгерскую политику в 1989 году. Ему было 27 лет. Венгрия хоронила социализм и в буквальном смысле – скончался ее многолетний руководитель Янош Кадар, и в переносном: венгерское общество перезахоронило прах жертв советского вторжения 1958 года. Над могилой казненного премьер-министра Имре Надя, отца раздавленной венгерской оттепели, лидер созданного за год до того Союза молодых демократов (ФИДЕС) Виктор Орбан потребовал проведения прозрачных демократических выборов и вывода советских войск.

Войска ушли бы и без Орбана. И выборы состоялись бы тоже без него. Но молодой, энергичный политик ассоциировался с переменами. К тому же в силу возраста он пока не мог претендовать на власть. И вполне понятно, с чего началась его карьера – с парламентской трибуны. В 1990 году он получает свой первый депутатский мандат – и подтверждает его на каждых очередных выборах. К тому же антикоммунистические и антисоциалистические взгляды Орбана легко находят отклик у большинства венгерских избирателей: маятник истории для Венгрии качнулся вправо.

Самый молодой премьер

1998 год показал: Венгрия дозрела до перемен. Премьер-министром стал 35-летний Орбан. Правительство было коалиционным, но программа была его – молодого премьера. Он обещал удержать инфляцию, сократить безработицу, снизить налоги и социальные отчисления. Он победил.

За Орбана голосовала молодежь. И не потому, что он сам был молод. Его программа была ориентирована на молодых людей. Он обещал отменить плату за высшее образование. Он стимулировал политику открытия новых рабочих мест. Он восстановил льготы для матерей.

«Он, он, он!» – скажет читатель. Да, он – Виктор Орбан. Политика правительства Венгрии была персонифицирована, как никогда. Орбан не скрывал: его устраивает германская модель руководства, когда вся власть находится в руках премьер-министра. Он боролся за это.



Но Венгрия быстро пресытилась жесткой и почти единоличной властью. Через четыре года ФИДЕС проиграла выборы, и Орбан ушел в отставку. Он решил не оспаривать проигрыш, а собраться с силами. Ему было что предъявить избирателям: его правительство привело Венгрию в Европейский Союз и НАТО. Зачем позориться и судиться с народом? Нужно подождать.

Уйти, чтобы вернуться

В 2006 году Орбан вновь возглавил список ФИДЕС и стал лидером оппозиции. Он почувствовал, куда склоняется общественное мнение Венгрии, и стал жестче, резче, правее и националистичнее. Его лозунги были адресованы всем этническим венграм – вне зависимости от того, где они жили. Он не предлагал возвращаться – он предлагал вместе строить новую Венгрию. Ту, лидером которой он хотел быть сам.

В результате изменения Конституции было сокращено число депутатских мандатов. Стало проще собирать парламентское большинство. Нужно было лишь сформулировать то, чего ждали избиратели. Орбан сделал ставку на правых националистов. Правительство отказалось от свободы абортов, оставив это право лишь за изнасилованными женщинами. Оно начало атаку на сексуальные меньшинства. И, наконец, главное: Орбан обещал построить великую Венгрию. Не Венгерскую Республику – Венгрию. Он заговорил о несправедливой потере территорий после Первой мировой войны. О необходимости защиты всех венгров, вне зависимости от того, где они проживают. Он снес памятники коммунистическим вождям и начал возвеличивать адмирала Хорти, верного сподвижника нацистской Германии.

Это могло отталкивать. Но в таких случаях важно вовремя найти общего врага.

Орбан против Сороса

Таким общим врагом Орбан назначил Джорджа Сороса. Миллиардер, заставивший пошатнуться британский фунт, стал главным мировым идеологом открытого общества. Он проповедовал всеобщее равенство – вне зависимости от национальности, вероисповедания, пола. А Орбан сделал ставку на закрытость. Символом этой закрытости станет позже забор, построенный вдоль венгерской границы – дабы нелегальные мигранты не могли проникнуть в страну.

В 1991 году Сорос попытался превратить Венгрию, свою историческую родину, в стартовую площадку для всей молодежи. Он открыл здесь Европейский университет, идеологической основой деятельности которого стали открытость и свобода. Орбан, проходивший в 1989 году стажировку по одной из соросовских программ, считал открытость и свободу в соросовском понимании избыточными. К тому же он видел в Соросе опасного соперника: Венгрия должна была стать страной одного вождя – и вовсе не Сороса.

Вернувшись во власть, Орбан начал атаку на Европейский университет. Он не учел лишь одного: идеалы Сороса были идеалами единой Европы. И Орбан получил репутацию автократа. Это мешало на международной арене, однако устраивало Орбана дома. Он публично говорил, что не считает европейскую модель идеальной, а в качестве образца предлагал Турцию Эрдогана и Россию Путина.

Орбан против Меркель

Однако, бросая вызов Соросу, Орбан не хотел ссориться с Брюсселем и Берлином. Венгрия вовсе не намеревалась отказываться от общеевропейских дотаций и программ. Наоборот. Националистический и авторитарный режим Орбана укреплялся на деньги единой Европы.

Главным предметом разногласий стала миграционная политика. Ангела Меркель требовала от всех государств Европейского Союза принять определенную квоту беженцев с Ближнего Востока и из Африки. Орбан не хотел этого. Беженцы превратились во второй жупел после Сороса, которым он пугал своих избирателей. Беженцы разрушат наш уютный мир, говорил он, отнимут наши рабочие места, отберут наши деньги и начнут уничтожать наше общество.

Ему поверили.

Нужно было лишь убедить Берлин в том, что политика Будапешта останется неизменной – несмотря на позицию госпожи «директора Европы». Нужно было получить мандат доверия избирателей. Орбан точно выбрал время: после «брекзита» Меркель не стала бы рисковать еще и потерей Венгрии.

Мандат получен

Выборы 8 апреля 2018 года стали торжеством Виктора Орбана. Он получил конституционное большинство в парламенте, а значит, получил и возможность менять Конституцию страны. Меркель, как и Сорос, лишились возможности говорить с премьер-министром Венгрии с позиции силы.

К тому же у Орбана всегда была достаточно гибкая внешняя политика. Он обнимался с Владимиром Путиным – но брал деньги в Брюсселе. Он отказывался принимать беженцев – но не отзывал венгерских депутатов из Страсбурга. Он находил общий язык со всеми, кто так или иначе был ему нужен. Этот Мальчиш-Плохиш с берегов Дуная в критический момент пообещал поддержку Ярославу Качиньскому, неформальному диктатору Польши, а значит, заключил союз, позволяющий блокировать принятие Брюсселем санкций против любой из двух этих стран.

И что вы теперь с ним сделаете? Ничего.

Но сам он твердо знает, что будет делать. Он будет строить нелиберальную демократию. Страну, которой можно править вечно.

Александр ФЕДУТА.

ЧУЛІ?

ЗША падтрымаюць рух Украіны ў НАТА?

Сталы прадстаўнік Злучаных Штатаў Амерыкі пры штаб-кватэры НАТА Кей Бэйлі Хатчынсан заявіла, што яе дзяржава падтрымае рух Украіны да членства ў Паўночна-Атлантычным Альянсе. Адпаведная заява была зроблена спадарыняй Хатчынсан падчас Кіеўскага форуму па бяспецы, арганізаванага фондам "OpenUkraine". "Мы жадаем, каб Украіна стала сябрам НАТА", – паведаміла яна.

Аднак яна папярэдзіла, што пачатак перамоў афіцыйнага Кіева з НАТА будзе ўспрыняты Крамлём вельмі жорстка. "У выпадку з Чарнагорыяй мы пабачылі, як рэагуе Расія, як яна стараецца змяніць сітуацыю, дэстабілізаваць яе", – таксама сказала Хатчынсан. Украінскія ўдзельнікі форуму адказалі, што гібрыдная вайна Расіі супраць іх дзяржавы ўжо вядзецца, таму страчваць няма чаго.

НА СУВЯЗІ – ТЭЛЬ-АВІЎ

Падрыхтоўка да парада непакоіць ізраільцян

Сотні жыхароў Тэль-Авіва звярнуліся да паліцыі горада праз дыспетчарскі тэлефон: іх занепакоіла тое, што баявыя самалёты лятаалі занадта нізка над горадам.

Званоты жыхароў ледзь не паралізавалі дзейнасць дыспетчарскай службы паліцыі. Прэс-служба ведамства была прымушана звярнуцца да жыхароў з паведамленнем, што нічога экстраардынарнага не адбываецца – усяго толькі рэпетыцыя парада Ваенна-паветраных сіл да Дня Незалежнасці Ізраіля.

ТАМ, В КИЕВЕ

Президент Украины Петр Порошенко предложил правительству подготовить документ об официальном прекращении участия страны в СНГ



Украинский лидер напомнил, что эта структура «отказалась осудить российскую агрессию» в Крыму и Донбассе.

О выходе из СНГ в Украине заговорили сразу после Евромайдана в 2014 году. В октябре того года в Верховную Раду внесли соответствующий законопроект.

Союз Независимых Государств был создан в 1991 году. В него входят постсоветские республики, кроме Грузии и стран Балтии. Пока единственной вышедшей из объединения страной стала Грузия – после российско-грузинской войны 2008 года.

Также Порошенко внесет в Верховную Раду законопроект о прекращении действия отдельных положений Договора о дружбе с Россией.

НА ДАЛОНЯХ ВЕЧНАСЦІ

Анатоль БУТЭВІЧ

Камянецкая вежа



Так склалася, што гэты больш як сямісотгадовы помнік стаў своеасаблівым апазнавальным знакам і абярэжным сімвалам Беларусі. Адлятаючы ў вырай, птушкі знарок робяць развітальны аблёт чырвонага стаўпа Белай вежы – каб надоўга запомніць галоўную прыкмету роднай зямлі. Вяртаючыся з далёкіх краёў, найперш шукаюць гэты сімвалічны арыенцір. Цэлы і непарушны ён – значыць, усё добра і спакойна на роднай Беларусі.

Калісьці даўным-даўно ляжаў тут чароўны камень. Валодаў ён незвычайным дарам – дапамагаць бедным людзям. І тыя часта карысталіся ягонай спагадлівасцю, прасілі парады, дапамогі. А то і хлеба. Прынясуць вечарам сякую-такую ахвяру і папросяць: «Камень-камянец, дай на заўтра хлябец. Цяжка стала жыць, няма чым дзяцей карміць». А ранічкай ляжыць на камені бохан.

Ды нейкі неразумны чалавек вырашыў выпрабаваць чароўную сілу каменя. Прыйшоў да яго без ахвяры і злосна загадаў: «Камень-камяніска, аддай сваё залаціска. Яно ў цябе без дзела ляжыць, а мне з ім будзе добра жыць». Абурыўся ад гэткага нахабства камень і праваліўся скрозь зямлю. А за сабой і сквапнага чалавека пацягнуў. Толькі глыбокі калодзеж утварыўся. А назва мясцовасці, дзе камень чароўны ляжаў, засталася – Камянец.

Засцярога тутэйшых жыхароў ад войнаў, якія знішчальнымі хвалямі захліствалі гарады, мястэчкі і вёскі, ад частых аблог, жорсткіх набегаў і крывавых штурмаў увасобілася ў шматлікія абаронныя збудаванні.

Такім помнікам абарончага дойлідства з'яўляецца і Камянецкая, альбо Белая, вежа, узведзеная па ўзоры валынскіх вежаў. Яны будаваліся ў XIII–XIV стагоддзях на беларускіх, украінскіх і польскіх землях. Служылі не адно ўмацаваннем жыллём, але былі цэнтрам абароны цэлых паселішчаў. Камянецкая – першая на Беларусі мураваная вежа-данжон. У XIII стагоддзі на беларускіх землях атрымаў шырокую прапіску гэты новы тып абарончых збудаванняў. Яны даўно мелі пашырэнне ў Цэнтральнай і Заходняй Еўропе, у Скандынавіі. Шматʼярусныя вежы-данжоны служылі апошнім прыстанішчам для абаронцаў, былі сапраўды непрыступнай цытадэллю. Гэта даказалі мураваныя вежы ў Камяньцы, Бярэсці, Гародні, Тураве, Навагародку і іншых беларускіх гарадах. Аднак да нашых дзён дажыў толькі Камянецкі стоўп.

Як сведчыць Галіцка-Валынскі летапіс, горад Камянец быў заснаваны ў 1276 годзе валынскім князем Уладзімірам Васількавічам – «вялікім кніжнікам і філосафам». Уладзімір даручыў «майстравітаму мужу» Алексу падшукаць месца для будучага абярэжнага горада. Той разам з мясцовымі жыхарамі на чоўнах паплыў у вусце ракі Лясной. Спадабалася яму адно месцейка – высокае, прыгожае. Згадзіўся князь з выбарам Алексы, загадаў збудаваць тут горад-крэпасць. Нават сама назва мясціна сведчыць пра яе непрыступнасць.

Галіцка-Валынскі летапіс паведамляў: «Князь же Володимер в княжении своем многы городы зруби по отци своем. Зруби Берестий, и за Берестием зруби город на пустом месте, нарицаемом Лестне, и нарече ему имя Каменец, зане бысть камена земля. Созда же в нем столп камен высотою 17 саженей, подобен удивлению всем зрящим на нь». Вежу, якую называлі яшчэ стаўпом Уладзіміра, абкружаў глыбокі роў і вал з драўлянымі ўмацаваннямі. Але ў 1903 годзе падчас абнаўлення помніка ўсё гэта знікла.

Лёгкасць, стромкасць, гатычная зграбнасць робяць пяціярусную вежу асабліва велічнай і вабнай – сапраўдны шляхцянкай. Гэта падкрэсліваюць і своеасаблівы арнамент з вузкіх акенцаў-байніц, падобных на аркі ніш, стрэльчатых вокнаў. Галаву прыгажуні, як шахматную ладдзю, вянчае вялікая карона з 14 зубцоў. Кожны з іх пазначаны нязіральнай шчылінай. Маючы 30 метраў увышкі, летапісны Камянецкі стоўп толькі на 5 метраў ніжэйшы за сярэдні неф знакамітага сабора Парыжскай Божай Маці.

Сцены вежы дасягаюць 2,5 метра ў таўшчыню, яе вонкавы дыяметр – 13,6 метра. Па цагляных сходах, што ўюцца ўнутры сцяны, пачынаючы з пятага яруса, можна трапіць на самы верх вежы, на яе былую баявую пляцоўку. Адсюль адкрываецца непаўторны краявід.

Калі вежу атуляе смуга альбо вяршыня яе хаваецца ў кудзелістых хмарах, тады здаецца, што няма ёй канца, што «столп камен» яднае грэшную зямлю з тым недасяжным сёмым небам, на якое безнадзейна імкнецца шмат хто з зямлян.

Калі жахае над ёй маланка і пагрозліва грукоча па небе сваёй калясніцай сівабароды Пярун, гэты стоўп, нібы грамнічная свечка, аберагае нашу зямлю і яе насельнікаў ад разбуральных праяў стыхіі і людской бяздумнасці.

Калі ж яе чырвоныя сцены лашчыць белымі палосамі-рукамі шчодры снегавей, тады ўяўляецца, што душы палеглых абаронцаў узносяцца ў неба, каб там стацца шчырымі малельнікамі за нашу з вамі бяспеку.

Камянец заўсёды меў асаблівае значэнне як памежнае ўмацаванне і важны гандлёва-рамесны цэнтр. Ён ляжаў на галоўным беларускім купецкім гасцінцы, які звязваў Брэст з Оршай. Адсюль гандлёвыя дарогі разыходзіліся на ўкраінскія, польскія і прыбалтыйскія землі. Праз Камянец праходзіў каралеўскі шлях з Кракава ў Вільню.

Зведаў Камянец і ваенную жорсткасць. Пасвісталі стрэл, звонам падкоў і мячоў, ваяўнічымі воклічамі не раз агучвалася ягонае наваколле. І душу веялі ад цела тут таксама не раз. Горад спусташалі крыжакі, прусы, шведы. Але адважныя камянцы дастойна супрацьстаялі сваім крыўдзіцелям. У складзе Берасцейскай харугвы яны пераможна змагаліся пад Грунвальдам. Хоць горад быў неадназова спалены і разрабаваны, ды вежа Уладзіміра выстаяла, вытрымала. Сумленна зрабіў сваю справу «майстравіты муж» Алекса.

Набыўшы сёння першапачатковы цёмна-чырвоны колер, «столп камен» працягвае сваю вартаўнічую вахту. Кожным трымцівым досвіткам супакойным полымем свечкі ўзносіць малітву – за мір і спакой на нашай зямлі, за зладжанасць і суладдзе між людзьмі і ў іхніх душах. І рабіць гэта будзе да скону часу.

ІХ ДЭМАКРАТЫЯ

Ільхам Аліеў датэрмінова пераабраўся прэзідэнтам

Прэзідэнт Азербайджана Ільхам Аліеў пацвердзіў свой мандат: згодна са звесткамі Цэнтрвыбаркама краіны, на прэзідэнцкіх выбарах, якія адбыліся 11 красавіка, ён атрымаў падтрымку 86% выбаршчыкаў. Гэта на 1,5% больш, чым на папярэдніх. Яўка выбаршчыкаў склала 74,5% ад агульнага спісу.

Апазіцыя лічыць, што Аліеў адмыслова абвясціў датэрміновыя выбары, бо мог прайграць, калі б яны адбыліся пазней. Магчымасць такога тактычнага кроку абмяркоўвалася палітолагамі яшчэ ў мінулым годзе.

Адным з першых павіншаваў свайго сябра беларускі прэзідэнт. У віншаванні Аляксандра Лукашэнкі гаворыцца аб "пераканаўчай перамозе" Ільхама Аліева і выказваецца спадзяванні на тое, што дзейнасць Аліева на пасадзе прэзідэнта Азербайджана ў бліжэйшыя сем гадоў будзе спрыяць усебаковаму развіццю сяброўскіх беларуска-азербайджанскіх адносін.

Нагадаем, што Ільхам Аліеў неадночы дапамагаў свайму беларускаму сябру і калегу – у тым ліку фінансава, калі трэба было тэрмінова выплачваць дзяржаўныя пазыкі, а Расія адмаўляла ў чарговым крэдытным траншы.

ФОТАФАКТ

Марозіва з цюльпанаў

Джэлацьеры – кандытары, якія спецыялізуюцца на гатаванні марозіва, – з італьянскага Карнарэда прапануюць у гэтым вясновым сезоне гасцям горада марозіва з цюльпанаў. Яно не толькі дэкарыруецца пялёсткамі кветак, але ж утрымлівае сіроп з іх.

Джэлацьеры з Карнарэда абяцаюць, што гэты пачастунак будзе заставацца ў меню да канца сезона цюльпанаў.



СКАНДАЛ

Стваральнік «Фэйсбука» выказаўся за кантроль над інтэрнэтам

Стваральнік сацыяльнай сеткі "Фэйсбук", адзін з найбагацейшых людзей свету Марк Цукерберг, даючы паказанні ў камісіі Сената Злучаных Штатаў Амерыкі, заявіў пра неабходнасць нейкіх формаў рэгулявання інтэрнэту. Нагадаем, што слуханні былі выкліканы інфармацыяй пра тое, што асабістыя звесткі больш як 87 мільёнаў амерыканцаў, якія захоўваліся ў "Фэйсбуку", былі атрыманы прыватнымі кампаніямі і, магчыма, выкарыстоўваліся падчас правядзення апошніх прэзідэнцкіх выбараў у ЗША. Цукерберг даваў паказанні на працягу амаль пяці гадзін.

Увядзенне кантролю над сацыяльнымі сеткамі зараз актыўна абмяркоўваецца не толькі ў Беларусі, але і ў Амерыцы. "Калі вы не возьмеце сітуацыю пад кантроль і не забяспечыце прыватнасць асоб у інтэрнэце, – заявіў Цукербергу кангрэсмен-дэмакрат Біл Нэльсан, – гэта зробім мы, Кангрэс".

ДАВЕДАЧНАЕ БЮРО



На пытанні чытачоў адказвае старшыня Пухавіцкай раённай арганізацыі ГА "Беларускае таварыства абароны правоў спажыўцоў" Васіль ВАЛАСЮК

Праз месяц сапсаваўся тэлефон

Месяц таму купіла тэлефон. Да гэтага ён працаваў нармальна, а затым перастаў уключацца, хаця апарат ніколі не падаў. Ці магу я здаць тэлефон у магазін на гарантыйны рамонт?

Святлана ЛЯСКОВА, г.Маладзечна.

– Безумоўна, можаце. Тым больш што тэрмін гарантыі яшчэ не закончыўся.

Вярнуць адзенне, якое было ва ўжыванні

Ці можна вярнуць адзенне неналежнай якасці, якое набыла ў магазіне секанд-хэнд?

Аліна, г.Стоўбцы.

– Нельга.

Набыў нязручныя навушнікі

Купіў навушнікі, яны былі ў спецыяльнай упакоўцы, якую дома давялося разразаць нажніцамі. Навушнікі мне не спадабаліся – не вельмі зручныя. Ці можна іх вярнуць у магазін на працягу 14 дзён?

Віталь МАЛАШЭНКА, г.Воранава.

– Такі тавар можна вяртаць і без упакоўкі, але пры наяўнасці ўсіх дакументаў, якія выдаваліся пры пакупцы.

Адмяніць заказ у інтэрнэт-магазіне

Вырашыла першы раз заказаць адзенне праз інтэрнэт-магазін. Што, уласна кажучы, і зрабіла. Але пасля вырашыла адмяніць заказ, бо сукенка без прымеркі можа і не падысці. Гэта можна зрабіць?

Валянціна КАРАНКЕВІЧ, Віцебск.

– Маеце на гэта поўнае права. Калі ж тавар вам ужо паступіў, то таксама можаце вярнуць яго на працягу 14 дзён.

Красоўкі з дэфектам

Купіў красоўкі, дома заўважыў, што падэшва доўга "жыць" не будзе. Як я павінен дзейнічаць, калі набыў у магазіне няякасны абутак?

Сяргей ПІЛІПУК, г.Лунінец.

– Нясіце абутак да прадаўца і патрабуйце альбо замены тавару, альбо вяртання грошай за няякасныя красоўкі.

Атрымаць кампенсацыю

Як атрымаць кампенсацыю за парушэнне тэрмінаў выканання работ?

Андрэй КАВАЛЕНКА, г.Лагойск.

– Кампенсацыя прызначаецца судовым рашэннем. За кожны пратэрмінаваны дзень – 1 працэнт ад сумы, якую заплаціў спажывец.

Вярнуць шыны ў магазін

Ці можна ў магазіне замяніць якасныя аўмабільныя шыны?

Сяргей АГАЛЕЦ, г.Вілейка.

– Можаце на працягу 14 дзён.

Футболка змяніла колер

Купіла ў магазіне футболку, памыла яе згодна з тымі рэкамендацыямі, што былі ўказаны на тавары, а яна пасля мыцця змяніла колер. Калі звярнулася ў магазін, то там адмовіліся вяртаць грошы: маўляў, сама сапсавала тавар. Як мне паступіць у гэтай сітуацыі?

Вера КАЛІНІНА, г.Ліда.

– Тут лепш правесці экспертызу, і эксперты дакладна вам скажуць, у чым справа. Калі тавар няякасны, то вам, безумоўна, вернуць грошы і кампенсуюць выдаткі на экспертызу.

Засталіся шпалеры

Набыла 4 трубкі шпалер, але адна трубка не спатрэбілася. Ці павінен магазін прыняць такі тавар назад?

Галіна КАЖАМЯКА, Гродна.

– Магазін не абавязаны прымаць шпалеры назад, хаця ў некаторых выпадках прадаўцы і не адмаўляюць спажыўцам.

АСОБА

Алесь ЦЫРКУНОЎ: «Мастаку ордэн не патрэбны...»

У мастака Алеся Цыркунова напярэдадні 70-гадовага юбілею адкрыліся адразу тры персанальныя выставы – у сталічным Палацы мастацтва, у Музеі гісторыі беларускай літаратуры і на сядзібе Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны. На жаль, не абышлося без скандалу – у музеі з экспазіцыі былі зняты некалькі карцін. Прычыны мастак патлумачыў у гутарцы з "Народнай Воляй".

– Спадар Алесь, дык што здарылася ў музеі?

– Яшчэ 22 сакавіка я дамовіўся з дырэктарам музея Зміцерам Яцкевічам аб правядзенні там выставы, прысвечанай юбілею Беларускай Народнай Рэспублікі. У дамоўлены час прывёз карціны, мы адабралі для экспазіцыі 10 твораў (больш там проста не змясцілася). Дырэктар іх бачыў. Мне трэба было адлучыцца – палову карцін вешалі без мяне. Пад вечар прыходжу, гляджу – паловы твораў няма! Знялі партрэт Дануты Бічэль, бо ў яе, маўляў, на плячах бел-чырвона-белы сцяг. Знялі партрэты Уладзіміра Дубоўкі і Янкі Купалы.

– А Купала чым правініўся?

– Відаць, тым, што вершы БНР прысвячаў. Той партрэт быў навеяны паэмай "На куццю". Яна была забаронена за савецкім часам, ды і цяпер у школах яе не вывучаюць. Нават настаўнікі гэтага твора не ведаюць. Там такія маналогі Князя і Ганца! *"За мною ўсцяж, і тут і там, / Іх вусны бледныя шаптали: / "Аддайце мову нашу нам! / Нашто схавалі-расхапалі?!"* Або: *"Багі другія верх бяруць, / Суды вядуць над нашым Краем, / Свяцільні ж нашы не замруць, / Што ў сэрцах вольных рассвятляем"*. Магутная паэма, не дзіва, што за яе Купалу ў свой час у нацыяналізме абвінавачвалі. Хацелі зняць і партрэт Рамана Скірмунта – а ён жа быў адным з прэм'ер-міністраў БНР! Без яго выстава губляла ўсякі сэнс, таму я проста ўчапіўся зубамі і адстаяў. Праўда, там па перыметры карціны напісаны словы Скірмунта пра адраджэнне беларускага народа. Дык іх у музеі завесілі вышываным ручніком – проста цырк нейкі! Я спытаўся, навошта ручнік, у заняпалай вёсцы бабкі так не робяць. А ў адказ: "Не чапайце, Алесь, бо нас з працы заўтра выганяць".

– На вашых карцінах часам аж цесна розным гістарычным персанажам, і ўсе яны пазнавальныя. А хто для вас гістарычная асоба №1 у Беларусі?

– Адназначна – Янка Купала. Ён – як мост з пракаветнай мінуўшчыны ў сучаснасць. У беларускай літаратуры хіба толькі Караткевіч змог так жа займальна і глыбока раскрыць нашу мінуўшчыну, звязаць яе з сучаснасцю. Я цяпер працую над цыклам карцін паводле паэмы "На куццю". Там 12 раздзелаў, яны для мяне як дынаміт выбухаюць. Шкада, што ні кампазітары нашы, ні тэатральныя рэжысёры не звярнулі ўвагу на гэту геніяльную паэму.

– Пісьменнік Уладзімір Арлоў любіць паўтараць: "Гісторыя – гэта цвік, на які я вешаю свае мастацкія палотны". Гістарычная тэма і для вас стала гэткім жа мацавальным цвіком?

– Так, гісторыя для мяне і натхненне, і галоўная тэма, і, калі хочаце, мацавальны цвік. Праз свае творы мастак павінен будзіць народ. Ён як гейналіст на вартавой вежы, падае сігнал, калі бачыць ворага. І на гук гейнала збіраецца народнае апалчэнне. На маё разуменне, прызначэнне мастацтва – разварушыць сонную чалавечую душу, каб чалавек стаў жыць і дыхаць на поўныя грудзі. А як разварушыць? Праз спазнанне гісторыі, праз яе вобразнае пераасэнсаванне. Выйдзіце на вуліцу і спытайцеся, хто такія Расціслаў Лапіцкі, Янка Філістовіч ці Янка Замара? А гэтыя людзі загінулі за незалежную Беларусь у адносна нядаўні час. І мы павінны пра іх памятаць.

– Надаўна "Народная Воля" паведамляла пра выставу беларускіх мастакоў у Парыжы, дзе іх карціны прадаваліся па 10.000 еўра. А вам творчасць істотна дапамагае ў матэрыяльным плане?

– Ага, дапамагае… Пенсія ў мяне, як у бамжа, – каля 200 рублёў. Ледзь выжываю. Карціны ўжо даўно ніхто не набывае. Да нядаўняга часу дзейнічала неафіцыйнае распараджэнне, якое забараняла дзяржаўным установам набываць творы мастакоў з суполкі "Пагоня". Нядаўна мае творы хацеў Нацыянальны мастацкі музей купіць. Іх самі музейшчыкі выбралі і ацанілі спачатку ў 3000 рублёў, потым у два разы чамусьці зменшылі цану. Але да куплі справа пакуль так і не дайшла.

– Вы адзіны беларускі мастак, які адлюстраваў на сваіх палотнах знакамітую бітву пад Монтэ-Касіна, што адбылася ў 1944 годзе. Перад гэтым вы пабывалі ў Італіі, дзе на месцы бітвы збудаваны велічны мемарыял. Што вас там найбольш уразіла?

– Тое, што там ні словам не згаданы беларусы. Хоць, як аргументавана паказаў гісторык Юрый Грыбоўскі ў сваіх даследаваннях, сярод загінуўшых пад Монтэ-Касіна кожны пяты – беларус. Там больш за 200 нашых суайчыннікаў ляжыць. Палякі, дарэчы, усталявалі там пампезны помнік. А ўвесь мемарыяльны комплекс – аграмадны, больш за Хатынь. Уразіла таксама, што там нанова адбудавалі кляштары – жаночы і мужчынскі, усё аднолькава, нават фрэскі. Цяжка паверыць, што там усё было дарэшты зруйнавана.

– Вы займаецеся яшчэ і ўсталяваннем мемарыяльных знакаў і капліц па ўсёй Беларусі. Памяць пра каго і дзе вы адзначылі такім чынам?

– У Курапатах ушанавалі Вацлава Ластоўскага – паставілі (разам з разьбяром Юрасём Камандзірчыкам) вялізны, амаль шасціметровы крыж, аздоблены металам. У вёсцы Чэхі на Мядзельшчыне паставілі Крыж усім святым Беларусі. У вёсцы Страча на Астравеччыне зрабілі капліцу пашаны паўстанцам 1794, 1831 і 1863 гадоў. У вёсцы Канябічы на Пастаўшчыне ўсталявалі помнік паўстанцам 1863 года Флярыяну Даноўскаму. А нядаўна мяне папрасілі зрабіць памятны знак святару-патрыёту Вінцэнту Гадлеўскаму. Калі ласка – выразаў з дубу мемарыяльную дошку, якую размясцілі на яго роднай хаце ў вёсцы Шурычы пад Поразавам.

– У вас ёсць узнагарода Чэхіі – медаль Масарыка. А беларуская дзяржава вашу творчасць як бы не заўважае. Не крыўдна?

– Я не хачу атрымліваць узнагароды ад цяперашняй беларускай улады. У нас жа ўсе ўзнагароды дыскрэдытаваны, нават ордэн Францішка Скарыны (ваша газета, дарэчы, пра гэта нядаўна пісала). Мне сорамна было б атрымаць той ордэн. Я разумею, калі чалавек на вайне быў і атрымаў узнагароду, напрыклад, ордэн Virtuti Militari, міжнародна прызнаны. А мастакі тут пры чым? Ім дзяржава прэміі і медалі дае хіба для таго, каб пасварыць, кагосьці наблізіўшы да "кармушкі", каб яны адзін аднаму зайздросцілі. Помню, як Аляксею Марачкіну хацелі даць званне заслужанага ці народнага, дык ён адмовіўся, патлумачыўшы, што звання мастака яму дастаткова. Тут я яго цалкам падтрымліваю.


– А прызнанне калег і сяброў для вас важнае? На выставе ў Палацы мастацтва я пагартаў кнігу водгукаў і пабачыў там запісы Алеся Разанава, Аляксея Марачкіна, Алеся Пушкіна, Уладзіміра Някляева…

– Прызнанне сяброў заўсёды прыемнае. Для таго і заводзіцца тыя кнігі водгукаў. Праўда, яны – як рыбацкія сеткі: часам вяртаюцца на бераг з уловам, а часам – пустыя. Тут трэба быць гатовым як да пахвалы, так і да крытыкі. А здаралася, што кніга водгукаў адыгрывала пэўную ролю ў лёсе мастака. Я добра памятаю, як недзе ў сярэдзіне 1980-х серыю карцін Міхаіла Савіцкага "Лічбы на сэрцы" павезлі на выставу ў Берлін. Сам ён не паехаў, бо казаў, што не можа чуць нямецкую мову… Выстава планавалася на месяц, а прыйшлося згарнуць яе праз тыдзень. Бо маладыя неанацысты пісалі ў кнізе водгукаў "Хайль Гітлер" і… падзякі Савіцкаму. Так яны ўспрынялі тыя "Лічбы на сэрцы". Пасля Берліна выставу меркавалася везці ў Парыж, але Луўр яе не прыняў. Так што розныя кнігі водгукаў бываюць.

– 2018-ы ў Беларусі абвешчаны Годам малой радзімы. Ці наведваеце вы сваю родную вёску Лясань пад Жлобінам?

– Вельмі рэдка. Апошні раз быў там гадоў 10 таму. Лясань цяпер – амаль цалкам паселішча дачнікаў. Праўда, "дзякуючы" Жлобінскаму металургічнаму заводу, паветра там не самае лепшае. А побач з Лясанню – вёска Мормаль, у якой нарадзіўся наш слынны багушэвічазнаўца Уладзімір Содаль (між іншым, нядаўна я напісаў яго партрэт). Я да васьмі гадоў жыў у вёсцы, а потым пайшоў па дзетдамах. Юнаком паехаў у Данбас на шахты. Вярнуўшыся, працаваў у калгасе. Памятаю, у касавіцу мы ездзілі на пароме праз Дняпро, а паром хадзіў пад чыгуначным мостам, які ахоўваўся вайскоўцамі. А я ўвесь час хадзіў з планшэтам і, маючы вольную хвіліну, садзіўся і маляваў. І вось плывём аднойчы, на пароме – вазы, коні, тлумна, а я залез у зацішны кутук, дастаў свае мастакоўскае начынне і – забыўся пра ўсё. Ажно раптам падыходзіць да мяне аўтаматчык: "Хто такі? З якой мэтай малюеш ваенны аб'ект?" Хацеў арыштаваць. Ледзь я тады адбіўся. Але потым у вёсцы яшчэ доўга мяне шпіёнам называлі.

Гутарыў Антось БРЫЛЕЎСКІ.



На фота: Алесь Цыркуноў і яго твор – партрэт паўстанца Міхала Валовіча.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Андрэй АРАМНАЎ: «Я вяртаюся!»

Алімпійскі чэмпіён па цяжкай атлетыцы распавёў "Народнай Волі" пра сваё складанае фінансавае становішча і жаданне зноў выступаць за зборную.

Днямі старшы трэнер нацыянальнай каманды па цяжкай атлетыцы **Віктар Шаршукоў** паведаміў, што ў хуткім часе можа адбыцца вяртанне ў вялікі спорт пераможцы пекінскай Алімпіяды.

"Пагутарыў у Барысаве з Арамнавым, і той сказаў, што ўжо месяц сур'ёзна трэніруецца і гатовы паказаць сябе на памосце, – распавёў Віктар Яўгенавіч. – *Але гэта не азначае, што месца ў зборнай для яго ўжо гарантавана. Гэта разумее і сам Андрэй. Ён жа зараз не на чэмпіёна свету замахваецца, а ставіць задачу прабіцца ў каманду і вытрымаць канкурэнцыю з моладдзю".*

– Зараз я працую трэнерам-педагогам у спартыўнай школе ў Барысаве, – *распавядае алімпійскі чэмпіён 2008 года.* – Заробак не вельмі, але, як кажуць, чым багаты... Без уліку падаткаў недзе 530 рублёў у месяц атрымліваецца.

– Наколькі вядома, акрамя гэтага вы яшчэ трэніруеце вучняў па сістэме "анлайн"…

– Так, але гэта вымушаны варыянт навучання, паколькі зараз у мяне няма магчымасці паўнавартасна рыхтавацца да спаборніцтваў. Трэба разумець, што на 500 рублёў асабліва не разгуляешся. Ды яшчэ і сям'ю трэба карміць.



Таму фактычна трэніруюся за кошт ахвяраванняў тых, каго трэнірую. Я здымаю на відэа розныя практыкаванні са штангай, паказваю, як трэба правільна яе падымаць, тлумачу ўсе памылкі. У кожнага майго вучня – індывідуальная праграма, і мы разам дыстанцыйна разбіраем усе сітуацыі падчас трэніровак.

– І хто да вас у асноўным звяртаецца?

– Абсалютна розныя людзі. І я разумею, што ў падзяку грошай проста няма, каб заплаціць за навучанне ў алімпійскага чэмпіёна. Але ўсё роўна даю ім нейкія парады, дапамагаю чым магу. А сістэма ахвяраванняў за вучобу ў мяне вельмі простая – "каму колькі не шкада". Таму людзі павінны разумець, што мой патрачаны час таксама чагосьці каштуе. Адным словам, калі ў некага маецца жаданне падтрымаць мяне матэрыяльна, то не адмаўляюся, але канкрэтныя сумы ніколі не называю.

– Дыстанцыйнае навучанне дае большыя магчымасці ў геаграфічным плане…

– Безумоўна, я ж магу па інтэрнэце звязацца з чалавекам у любой кропцы планеты. Таму сярод маіх навучэнцаў не толькі беларусы, але і атлеты з Расіі, Украіны, Англіі і іншых краін. Многім падабаецца відэазлог, які я вяду ў інтэрнэце, таму просяць, каб не спыняў гэтую справу. Нават новую камеру мне падарылі, каб палепшыць якасць відэа.

– А самі вы таксама рэгулярна трэніруецеся?

– Безумоўна, бо ўжо ў маі збіраюся правесці збор з нацыянальнай камандай. Адным словам, я вяртаюся!

– З'явілася жаданне зноў выступаць за зборную?

– Жаданне з'яўляецца тады, калі знікаюць праблемы. І калі апошніх будзе шмат, то нават і не ведаю, у які бок хіснецца сітуацыя. У той жа час я разумею, што гэта, можа быць, апошні шанц яшчэ раз выйграць Алімпійскія гульні. А можа, і перадапошні…

– Вы маеце на ўвазе фінансавыя праблемы ці хваляе здароўе?

– Найперш мяне хваляюць фінансы, якія, як ужо казаў, спяваюць рамансы. Я пакуль неатэставаны спартсмен, таму не маю заробку, мяне не запрашаюць на зборы, хаця стаў чэмпіёнам вобласці і афіцыйна выступаю за Барысаў. Таму падрыхтоўку трэба весці толькі за ўласныя грошы, і гэта досыць складана. Але, спадзяюся, мы ўсё вытрымаем.

Алесь СІВЫ.

К СВЕДЕНИЮ

Как будут работать поликлиники в праздничные дни

График работы амбулаторно-поликлинических организаций здравоохранения, организаций переливания крови, санитарно-эпидемиологических, аптечных, медицинской техники, особого типа и иных:

14 апреля – по графику работы рабочего дня;
15 апреля – по графику выходного дня;
16 апреля –по графику работы в субботний день;
17 апреля – по графику работы в праздничный день;
28 апреля – по графику рабочего дня;
29 апреля – по графику выходного дня;
30 апреля – по графику работы в субботний день;
1 мая – по графику работы в праздничный день.

График работы больничных организаций здравоохранения:

14 апреля – по графику работы в субботний день;
15 апреля – по графику выходного дня;
16 апреля – по графику рабочего дня;
17 апреля – по графику работы в праздничный день;
28 апреля – по графику работы в субботний день;
